

ПАРТЫЗАНСКІЯ РУКАПІСЫ НЕ ГАРАЦЬ 11

ПРА ДОПІНГ, ЗДАРОЎЕ І ПСІХАЛОГІЮ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ЛІСТАПАДА 2018 г. СУБОТА № 222 (28838)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Уладзімір СЯМАШКА, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі:**

*«Глабальнае разуменне ў плане пошуку алгарытму кампенсацыі страт беларускай эканомікі з-за падатковага манеўру ў нафтавай галіне Расійскай Федэрацыі ў бакоў ёсць. Перагаворы ідуць няпроста. Адна з задач — знайсці спосаб вырашэння гэтай праблемы. Апошні пратакол, які я падпісаў з Козакам, калі яшчэ быў віцэ-прэм'ерам, вызначыў тэрмін: да 15 снежня знайсці формулу, алгарытм, як мы будзем рухацца, як будзем падатковы манеўр нейтралізаваць і ў Расіі, і ў Беларусі. Ёсць у нас і іншыя праблемы, напрыклад пастаўак тэхнікі, гэта таксама трэба здымаць».*

# АСНОВА ЖЫЦЦЯ ДЗЯРЖАВЫ

***Работнікам сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу***

*Паважаныя працаўнікі вёскі!*

*Віншую вас з прафесійным святам.*

*Нялёгкая сельская праца ляжыць у аснове жыцця дзяржавы, яе незалежнасці і справядліва карыстаецца ў народзе вялікай павагай.*

*Дзякуючы вашай стараннасці і руплівасці стаўленню да багаццяў роднай прыроды гарантавана харчовая бяспека Беларусі. Нашы якасныя натуральныя прадукты і сыравіна дазваляюць айчынным вытворцам займаць годныя пазіцыі на сусветным рынку.*

*Усе дасягненні аграпрамысловага комплексу — гэта вынік захавання пераемнасці вопыту і ведаў ветэранаў вытворчасці, разумнага спалучэння традыцый і сучаснага навукова-тэхналагічнага падыходу.*

*Перакананы, што добрасумленнае стаўленне да сваёй справы працаўнікоў палёў і перапрацоўчых вытворчасцяў, вучоных-аграрыяў, машынабудаўнікоў, работнікаў сэрвісных службаў, спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы ў вёсцы заўсёды будзе спрыяць эфектыўнаму развіццю беларускай эканомікі.*

*У гэты святочны дзень шчыра жадаю вам нязменна спрыяльнага надвор'я і высокіх ураджаяў. Здароўя, шчасця і дастатку вам і вашым сем'ям.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота БелТА.

**КОРАТКА**

- **Праект генеральнага пагаднення паміж урадам Беларусі, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 2019—2021 гады распрацаваны ў Беларусі.**
- У Віцебску адкрылі памятны знак у гонар 30-годдзя ўтварэння атрада міліцыі асобага прызначэння ў Беларусі.



- **Новыя малочнатаварныя фермы пабудуюць у 13 раёнах Брэсцкай вобласці ў 2019 годзе.**
- Паслугі лазняў агульнага карыстання і душавых, размешчаных у сельскай мясцовасці, будуць уключаны ў пералік сацыяльна значных тавараў і паслуг, цэны на якія рэгулююцца аблвыканкамамі.

Персона

# ЧАЛАВЕК ЗЯМЛІ

**«Звязда» ўжо неаднойчы пісала пра гэту незвычайную жанчыну. Жанчыну, якая амаль дзесяць гадоў кіруе адной з найлепшых гаспадарак у краіне. Якая прадстаўляе Мінскую вобласць у верхняй палаце парламента. Якая ўмее прымаць гасцей самага высокага ўзроўню і выклікаць у іх захапленне зробленай справай. Гэтую справу яна робіць не адна, а разам са сваім калектывам. Ёй удаецца кіраваць камандай у 500 чалавек так, каб кіраўнік дзяржавы назваў гаспадарку ўзорнай. Пры гэтым яна пакідае ўражанне чалавека мяккага, інтэлігентнага і паэтычнага. Нагода для сённяшняй сустрэчы з Нінай ЖАЛЯЗНОВАЙ, намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Азярыцкі-Агра» Смалявіцкага раёна, — свята. Прафесійнае свята ўсіх людзей, якія працуюць на зямлі. Якія, як яна сказала, кормяць свет.**

СТАР. 4



ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# НЕ ГАЗАМ АДЗІНЫМ

## Прэзідэнт даручыў распрацаваць план пашырэння выкарыстання электраэнергіі

**Такую задачу Аляксандр Лукашэнка паставіў на нарадзе па пытанні ўдасканалення сістэмы кіравання беларускай энергетыкай.**

### Адмовіліся ад імпарту

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, стабільнасць энергетычнай сістэмы Беларусі — вельмі важны элемент бяспекі і незалежнасці нашай дзяржавы. «Для вырашэння актуальных задач у галіну было ўкладзена нямала сродкаў, — нагадаў Прэзідэнт. — Толькі за апошнія пяць гадоў прыцягнута звыш мільярда долараў інвестыцый». За гэты перыяд наша краіна выйшла на перадавыя пазіцыі сярод дзяржаў СНД па ўдзельным расходзе паліва на вытворчасць аднаго кілавата электраэнергіі.

Акрамя таго, спажыванне імпартаванага паліва зменшылася на тры мільярды кубаметраў газу ў эквіваленце, гэта эканомія каля 600 мільёнаў долараў у год. Пры гэтым уласная вытворчасць электраэнергіі павялічылася на 2,1 мільярда кілават. «Дарэчы, у 2018 годзе мы ўпершыню цалкам адмовіліся ад імпарту электрычнай энергіі», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

### Рухацца далей — але без эксперыментаў

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што яму неаднаразова дакладвалі: энергасістэма Беларусі не толькі адна з самых надзейных і эфектыўных на постсавецкай прасторы, але і не саступае шэрагу еўрапейскіх дзяржаў. «Аднак, нягледзячы на дасягнутыя поспехі, да працы нашых энергетыкаў ёсць нямала прэтэнзій і заўваг», — сказаў ён.

Так, наспела неабходнасць вызначыць, што трэба зрабіць не толькі для ліквідацыі існуючых недахопаў, але і для павышэння эфектыўнасці работы ўсёй энергасістэмы. На думку многіх экспертаў, для таго каб выбудаваць выразны план дзеянняў, у галіны ёсць эканамічныя, тэхналагічныя і арганізацыйныя рэзервы.

«Падкрэслю, ніякіх эксперыментаў мы праводзіць не будзем. У нас няма незразумелых пытанняў, каб эксперыментаваць. Усё крайне зразумела. Галоўная задача — не загубіць дасягненні, удасканальваць тое, што створана, пры гэтым не зацягваючы працэс. Таксама трэба ўлічваць сусветныя тэндэнцыі ў энергетыцы, выкарыстоўваючы як станоўчы, так і негатыўны вопыт, перш за ўсе нашых суседзяў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, мэтамі гэтай працы павінны стаць аптымізацыя дзейнасці энергасістэмы, ліквідацыя залішніх выдаткаў, справядлівае і празрыстае фарміраванне тарыфаў на канкурэнтным узроўні. Таксама неабходна прыцягнуць у галіну і найноўшыя тэхналогіі, што і робіцца.

### Нам патрэбен план

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на вельмі нізкім узроўні спажывання электрычнай энергіі, характэрным для Беларусі. «Нездарма ў апошні час толькі лянівы не кажа пра тое, што ў нас будзе значны лішак электрычнай энергіі, асабліва пасля ўводу атамнай электрастанцыі. Дарэчы, гэта галоўнае пытанне ва ўсім рэфармаванні гэтага сектара або яго ўдасканаленні», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што ўрад пакуль не прапануе рашэння гэтага пытання. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што надыходзіць эра чыстай энергетыкі, вугаль, прыродны газ і нафта здаюць пазіцыі. «Трэба не проста дакладнае разуменне, а план дзеянняў, зыходзячы з балансу вытворчасці электраэнергіі і спажывання. І ў першай палове наступнага года запланугйце яго разгляд», — дадаў ён.

«Урадам павінен быць распрацаваны дакладны і рэалістычны план пашырэння напрамкаў выкарыстання электраэнергіі ў прамысловасці, аграрнай, транспартнай сферах, IT-сектары, ЖКГ, побыце і іншых галінах. Гэтае пытанне непарыўна звязана з далейшым развіццём беларускай энергетыкі. Таму я патрабую ад адказных асоб, не зацягваючы, прыступіць да яго рашэння», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён нагадаў, што магутнасцяў для нарошчвання электраспажывання сёння ў нас хапае, хутка будзе яшчэ больш.

### Што, як і калі?

Таксама Прэзідэнт даручыў ураду сфарміраваць прагноз паліўна-энергетычнага балансу краіны, а таксама вызначыў мэту — 100-працэнтная энергетычная незалежнасць і бяспека.

Аляксандр Лукашэнка задаў прысутным на нарадзе наступныя пытанні: якія недахопы ёсць у дзеючай структуры энергасістэмы Беларусі? Што прапануе ўрад для ўдасканалення галіны? Якія тэрміны і рызыкі?

Таксама ён пацікавіўся, які эфект дадуць прапанаваныя пераўтварэнні для энергасістэмы, айчыннай эканомікі і нашых грамадзян. І як удзельнікі нарады бачаць у перспектыве паліўна-энергетычны баланс краіны.

Намеснік прэм'ер-міністра Ігар Ляшэнка праінфармаваў, што зараз у структуру Мінэнерга ўваходзяць 78 арганізацый колькасцю больш за 96 тысяч чалавек. У прамым падначаленні Мінэнерга знаходзіцца тры арганізацыі — «Белэнерга», «Белпалівагаз», дзяржаўнае прадпрыемства «Беларуская АЭС».

У мэтах павышэння эфектыўнасці вытворчасці энергіі і дыверсіфікацыі відаў паліва ў энергасістэме праведзена маштабная работа па мадэрнізацыі вытворчых фондаў. Гэта дазволіла з 2013-га па 2017 год знізіць удзельны расход паліва на вытворчасць электраэнергіі на 24 грамы ўмоўнага паліва і дасягнуць 232,1 грама на адну кілават-гадзіну.

### Дапрацаваць і паказаць

Па выніках нарады намеснік прэм'ер-міністра Ігар Ляшэнка пагутарыў з журналістамі.

«Ад кіраўніка дзяржавы паступілі заўвагі, якія патрабуецца разгледзець нам на працягу месяца. І вось з гэтымі заўвагамі ўжо, разлічанымі, дапрацаванымі, прадставіць удасканаленую праграму. Так што ў нас працэс яшчэ наперадзе», — заявіў ён.

Прэзідэнт таксама заявіў, што неабходна выкарыстоўваць больш электраэнергіі ў розных галінах. Ці ёсць ва ўрада план разумення, як гэта зрабіць? «Натуральна, план разумення ёсць. Міжведамасная рабочая група працуе над такімі прапановамі», — запэўніў віцэ-прэм'ер.

Адна з прапаноў: напрыклад, у юрыдычных асоб будуць зноўшвацца ўласныя генерыравальныя магутнасці. Прапануецца не аднаўляць гэтыя магутнасці, а за кошт уводу атамнай электрастанцыі, за кошт росту ўласных магутнасцяў электраэнергіі прапаноўваць больш ільготную стаўку тарыфу.

Яшчэ адна прапанова, якая разглядаецца і датычыцца насельніцтва: у начны час сыходзіць ад падагрэву вады газам да падагрэву электрычнасцю і ўжываць паніжаны тарыф. «Сума досыць значная», — сказаў Ігар Ляшэнка пра магчымую эканомію.

Па словах віцэ-прэм'ера, арыенціровачна з першага студзеня з'явіцца нарматыўна-прававы дакумент, згодна з якім у новабудоўлях будуць прымяняцца электрапліты, таксама яны будуць выкарыстоўвацца пры мадэрнізацыі пабудаванага жылля.

На думку Ігара Ляшэнкі, калі разглядаць без механізма субсідавання, то зразумела, што тарыф па электраэнергіі павінен быць больш выгадны, чым тарыф па газе.

Які вынік чакаецца ад пераўтварэнняў? Больш эфектыўная работа галіны. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў дакладнага эканамічнага абгрунтавання ўсіх магчымых змен.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# НА НАЙВЫШЭЙШЫМ УЗРОЎНІ

Учора адбылася тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна. Прэзідэнты Беларусі і Расіі абмеркавалі па тэлефоне беларуска-расійскі парадак дня і графік кантактаў на найбліжэйшую перспектыву. Размова адбылася па ініцыятыве расійскага боку.

Бакі адзначылі высокую дынаміку кантактаў у гэтым годзе і абмеркавалі найбольш актуальныя пытанні для дзвюх дзяржаў, а таксама ўзаемадзеянне на інтэграцыйных пляцоўках.

* * *

Таксама ў пятніцу Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з экс-прэзідэнтам Латвіі Гунтысам Улманісам.

Экс-прэзідэнт Латвіі адзначыў, што прыйшоў на сустрэчу з вялікім жаданнем, як да блізкага чалавека. Ён нагадаў Аляксандру Лукашэнку аб іх сустрэчах у Літве, Польшчы, на розных мерапрыемствах. «Добра, што ёсць што ўспомніць», — сказаў беларускі лідар.

Гунтыс Улманіс заявіў, што ніхто ніколі не сапсуе іх сардэчныя ўзаемаадносіны з Прэзідэнтам Беларусі, якія былі і ёсць. Ён падзякаваў кіраўніку дзяржавы за магчымасць сустрэцца. Яшчэ Гунтыс Улманіс нагадаў, што чакае беларускага лідара ў Рызе.

***

Як паведамляе прэс-служба Прэзідэнта, у панядзелак Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым, які наведае Беларусь з афіцыйным візітам. Кіраўнікі дзяржаў падрабязна абмяркуюць стан і перспектыўныя напрамкі развіцця адносін паміж Беларуссю і Азербайджанам, абмяняюцца думкамі па актуальнай міжнароднай праблематыцы.

Асноўная ўвага будзе аддадзена гандлёва-эканамічнаму і інвестыцыйнаму супрацоўніцтву, рэалізацыі сумесных праектаў. Прэзідэнты таксама разгледзяць магчымасці па ўзаемадзеянні ў транспартна-лагістычнай сферы, сферах аховы здароўя, адукацыі, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, спорту, турызму.

Перагаворы пройдуць у фармаце «сам-насам» і ў пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый, па выніках чакаецца падпісанне шэрагу міжнародных дакументаў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРАЦЯГВАЕ ПРЫЁМЫ

**Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае ажыццяўляць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах.**

**20 лістапада** ў Салігорскім райвыканкаме прыём правядзе памочнік Прэзідэнта — **інспектар па Мінскай вобласці Ігар Уладзіміравіч ЯЎСЕЕЎ** (10.00 — 13.00).

**21 лістапада** ў Клічаўскім райвыканкаме на пытанні адкажа памочнік Прэзідэнта — **інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь Міхайлавіч ЛАЎРАНКОЎ** (10.00 —12.00 (прамая тэлефонная лінія), 12.00 — 14.00 (асабісты прыём).

**21 лістапада** ў Глыбоцкім райвыканкаме грамадзян таксама выслухае памочнік Прэзідэнта — **інспектар па Віцебскай вобласці Віталь Міхайлавіч ВОЎК** (10.00 — 13.00).

**22 лістапада** ў Мазырскім райвыканкаме прыём правядзе **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Максім Уладзіміравіч РЫЖАНКОЎ** (11.00 — 14.00).

**23 лістапада** ў Хойніцкім райвыканкаме адбудзецца прыём у **намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Рыгоравіча ЖАЎНЯКА** (14.00 — 17.00).

**Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Аднапартыйцы Мэй набралі дастаткова галасоў, каб пачаць працэдуру яе адхілення

Група еўраскептыкаў у кіручай Кансерватыўнай партыі Вялікабрытаніі атрымала дастатковую падтрымку для таго, каб ініцыяваць у парламенце галасаванне па пытанні аб даверы прэм'ер-міністру Тэрэзе Мэй, паведаміў тэлеканал Sky News.

Па словах яго крыніцы ў парламенце, правядзенне галасавання па вотуме ў найбліжэйшы час «вельмі магчымае». У рэзідэнцыю кіраўніка ўрада выкліканы парламентарыі, якія адказваюць за партыйную дысцыпліну падчас галасаванняў па ключавых пытаннях.

Паводле статута кіруючай кансерватыўнай партыі, працэдура запускаецца ў тым выпадку, калі 15 % парламентарыяў-торы (48 чалавек) накіроўваюць кіраўніку камітэта ліст аб страце даверу да прэм'ера.

## СМІ: Абэ паабяцаў Пуціну не размяшчаць базы ЗША на паўднёвых Курылах



Прэм'ер-міністр Японіі Сіндза Абэ падчас перагавораў з прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным заявіў, што ў выпадку магчымай перадачы японскаму боку часткі паўднёвых Курыльскіх астравоў там не будуць размешчаны ваенныя базы ЗША. Пра гэта ўчора паведаміла газета Asahi Shimbun.

Адзначаецца, што такім чынам Абэ пацвердзіў рашучасць працягваць перагаворы па тэрытарыяльным пытанні і мірным дагаворы на аснове Сумеснай дэкларацыі СССР і Японіі ад 1956 года, у якой Масква выказала гатоўнасць у якасці жэсту добрай волі пасля заключэння пагаднення аб міры перадаць Японіі востраў Шыкатан і шэраг дробных незаселеных астравоў Малой Курыльскай грады, якія ў Японіі называюць Хабамаі. Акрамя таго, такім чынам японскі прэм'ер разлічвае прадэманстраваць, што дагавор аб бяспецы з ЗША не мае на мэце магчымасць размяшчэння ваенных баз у любым раёне Японіі без згоды Токіа.

## У КНДР правялі выпрабаванні новай зброі

Лідар КНДР Кім Чэн Ын асабіста праінспектаваў выпрабаванні новага перадавога стратэгічнага ўзбраення, якія былі паспяхова праведзены на палігоне ў Акадэміі абаронных навук. Пра гэта ў пятніцу паведаміла агенцтва ЦТАК.

«Пасля дэманстрацыі моцы новай зброі вярхоўны лідар Кім Чэн Ын заявіў, што вучоныя і прамыслоўцы выканалі вялікую работу, якая заклікана павысіць абараназдольнасць краіны», — паведамляе агенцтва. Кім Чэн Ын таксама заявіў, што КНДР па-ранейшаму аддае прыярытэт развіццю абаронных тэхналогій і навуковых распрацовак у гэтай сферы.



Ніякіх падрабязнасцяў пра тое, якая менавіта зброя была выпрабавана, не прыводзіцца. Пры гэтым ЦТАК адзначае, што яе распрацоўка пачалася яшчэ пры папярэднім лідары КНДР Кім Чэн Іры.

Апошні раз СМІ краіны паведамлялі аб прысутнасці Кім Чэн Ына на выпрабаваннях зброі ў лістападзе мінулага года. Тады Пхеньян правёў запуск міжкантынентальнай балістычнай ракеты новага тыпу «Хвасон-15», якая, паводле ацэнак экспертаў, мае далёкасць палёту каля 13 тысяч кіламетраў.

У красавіку гэтага года КНДР абвясціла пра адмову ад правядзення тэстаў ядзернай зброі, а таксама балістычных ракет рознай далёкасці з мэтай развіцця сацыялістычнай эканомікі краіны і павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва.

# СУЧАСНЫЯ ІНАВАЦЫІ

## Беларускія навукоўцы прадставілі на юбілейнай выстаўцы Нацыянальнай акадэміі навук больш за 300 новых распрацовак і тэхналогій



**Урачыстае мерапрыемства, прысвечанае 90-годдзю НАН Беларусі, сабрала навукоўцаў з блізкага і далёкага замежжа.**

Удзельнікаў урачыстага сходу і ўсю навуковую супольнасць павіншаваў са святам **доктар эканамічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, старшыня Савета Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:** «Нацыянальная акадэмія навук і беларускія навукоўцы акружаны ўвагай дзяржавы. І з'езды, рашэнні па ключавых пытаннях, безумоўна, спрыяюць эфектыўнай даследчыцкай дзейнасці. Канешне, хацелася б выказаць і некаторыя пажаданні. Сёння свет без межаў, таму тая дзейнасць, якую ажыццяўляе Нацыянальная акадэмія навук на знешніх рынках, — гэта вельмі правільны напрамак, і я думаю, што яна будзе замацавана ў далейшых намаганнях навукова-даследчыцкіх інстытутаў і непасрэдна за кожным навукоўцам. Навука па сваёй сутнасці інтэрнацыянальная, і чым больш будзе праектаў з удзелам замежных калег, тым больш будзе стымулаў для таго, каб працаваць яшчэ больш эфектыўна».

Асобна старшыня Савета Рэспублікі спыніўся на тэме інтэлектуальнай уласнасці. «Трэба разбудзіць ініцыятыву ў навукоўцаў, трэба больш матываваць маладых на ўтварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці», — падкрэсліў ён.



У рамках юбілею ў Нацыянальнай акадэміі навук была арганізавана маштабная выстаўка навукова-тэхнічных дасягненняў вучоных НАН Беларусі. На ёй прадстаўлены вынікі работы вучоных у прыярытэтных навуковых напрамках: медыцыне, біялогіі, аграрнай і фізіка-тэхнічных навуках, а таксама фізіцы, матэматыцы і інфарматыцы.

Найноўшымі распрацоўкамі ў галіне біяфізікі і клетачнай інжынерыі падзяліўся **Андрэй ГАНЧАРОЎ, кандыдат медыцынскіх навук:** «На нашым стэндзе прадстаўлены розныя ўзоры клетак для рэгенератыўнай медыцыны, а таксама імунасупрэсіўнай тэрапіі. Таксама прадстаўлены клеткі для гаення скураных пакроваў, якія выкарыстоўваюцца ў касметалогіі. Акрамя гэтага, ёсць узоры клетак для лячэння афтальмалагічных захворванняў».

**Прадстаўнік НПЦ шматфункцыянальных беспілотных комплексаў, намеснік дырэктара па навуковай рабоце, намеснік галоўнага канструктара Аляксандр ШЧАЎЛЕЎ** расказаў аб дронных распрацоўках: «Нашыя апараты выкарыстоўваюцца ў Міністэрстве надзвычайных сітуацый для маніторынгу лясных пажараў і іншых мерапрыемстваў, напрыклад для пошуку зніклых людзей. У перспектыве выкарыстанне лятальных апаратаў у сельскай гаспадарцы для вырашэння задач дакладнага земляробства: здымкі палёў, кантроль стану ўраджайнасці. Рабочая вышыня апаратаў — 500—1000 метраў, але яны ўзнімаюцца аж да чатырох кіламетраў над зямлёй. Унікальнай мадэллю з'яўляецца дырыжабль, паколькі ён можа выкарыстоўвацца для назірання за запаведнікамі, дзе трэба павольна і ціха лятаць, лічыць жывёл і кантраляваць іх папуляцыю. Яго можна выкарыстоўваць і для здымкі гарадскіх мерапрыемстваў».




Фота Андрэя САЗОНАВА.

Інстытут пладаводства апошнім часам працуе над сартамі грэцкага арэха. У перспектыве разглядае работу з фундуком і міндалём. Таксама на стэндзе інстытута дэманстраваліся грушы новага сорту «Завея», якія можна захоўваць да лютага.

Усяго на выстаўцы прадстаўлена больш за 300 новых беларускіх распрацовак і тэхналогій. З віртуальнай выстаўкай НАН Беларусі можна азнаёміцца на сайце Рэспубліканскага цэнтра трансферу тэхналогій па адрасе http://ictt.by/exh-nasb.

**Ганна ЮНЧЫЦ.**

Я зноў выбіраю «Звязду»

## На новае месца — са старым сябрам

Неяк задумалася: а колькі ж гадоў выпісваю сваю любімую газету? Мо з трыццаць, дакладна не менш. Некалі маладым спецыялістам калгаса як пачала чытаць беларускае выданне, дык не перастаю да гэтай пары. Большая частка майго працоўнага жыцця прайшла ў вёсцы Петкавічы, тут выйшла на пенсію. Мужа пахавала, адна дачка жыве ў далёкім замежжы, другая хворая, я яе даглядаю. У вёсцы стала жыць цяжка з хворым чалавекам на руках. Таму купіла кватэру ў пасёлку Жамчужны, побач з горадам, тут лепшыя ўмовы. Ужо сабралася пераязджаць, думала не выпісваць газету на нейкі час, а потым зрабіць гэта на новым месцы. А паштальёнка кажа: "Як жа ты будзеш без сваёй «Звязды»? Выпісвай, а там перавядзём на новы адрас". Так я і зрабіла, і ўдзячная ёй за падказку.

Нават збіраючы пакункі для пераезду, перачытвала асобныя нумары, якія шмат гадоў таму адкладвала... Вечарам разгарну газету, нібы з сябрам сустрэнуся. Люблю чытаць пра тое, як людзі жывуць у розных вёсках, ахвотна чакаю аўтарскія калонкі, люблю «вясёлыя і праўдзівыя» гісторыі, чытацкае спаборніцтва пад здымкамі Анатоля Клешчука. Раней ахвотна разгадвала сканворды, сумую па іх... Не прапускаю парады садаводам і агароднікам — я ж аграном па адукацыі. У сваім садзе эксперыментавала з ігрушамі, іншымі дрэвамі. Вось і сёлета грушамі частавала аднавяскоўцаў да самага пераезду, да халадоў.

Спадзяюся, што на новым месцы складуцца добрыя адносіны з суседзямі і з іншымі людзьмі. А «Звязда», мой стары сябар, які і тут застаецца са мной.

**Тамара МАРКУШЭЎСКАЯ,**
*Баранавіцкі раён.*




## Масква салютавала вызваленню Рэчыцы

**У нядзелю, 18 лістапада, раённы цэнтр Рэчыца адзначыць 75 гадоў вызвалення ад фашысцкіх захопнікаў.**

Гэта аперацыя войскаў Беларускага фронту ўвайшла ў падручнікі гісторыі пад назвай Гомельска-Рэчыцкай. Яна пачалася 10 лістапада 1943 года з плацдарма на заходнім беразе Дняпра каля Лоева ў кірунку на Рэчыцу і Калінкавічы. Ударам у тыл саперніка войскі фронту 15 лістапада перарэзалі чыгунку Гомель — Калінкавічы, 18 лістапада вызвалілі Рэчыцу. Горад вызваляла 65-я армія генерал-лейтэнанта Батава пры падтрымцы аднаго са стралковых карпусоў 48-й арміі генерал-лейтэнанта Раманенкі і брыгад гвардзейскага Данскога танкавага корпуса. Войскам, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Рэчыцы, была абвешчана падзяка, а вечарам 18 лістапада ў Маскве быў дадзены салют. Гэта быў першы салют за вызваленне гарадоў на тэрыторыі Беларускай ССР у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Пры вызваленні Рэчыцы і населеных пунктаў раёна загінула больш за пяць тысяч салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі.

Гомельска-Рэчыцкая аперацыя завяршылася 30 лістапада. У выніку яе войскі Беларускага фронту прасунуліся на захад на 130 кіламетраў. Такім чынам былі створаны спрыяльныя перадумовы для далейшага вызвалення Беларусі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Рынак працы

## Нефармальная адукацыя будзе мець вагу

### Што зменіцца ў сістэме падрыхтоўкі кадраў

**Пра тое, што Нацыянальная сістэма кваліфікацый патрабуе ўдасканалення, размовы вядуцца ўжо даўно. «Навучанне традыцыйнымі метадамі моцна адстае ад рэальных патрэб эканомікі. Сёння работадаўца атрымлівае спецыяліста, якога часта даводзіцца давучваць», — выказаўся першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ. Прычынай дысбалансу попыту і прапановы рабочай сілы ён назваў недастатковую ўзгодненасць сферы адукацыйных паслуг і рынку працы.**

Таму 24 кастрычніка гэтага года пастановай Савета Міністраў была зацверджана Стратэгія ўдасканалення Нацыянальнай сістэмы кваліфікацый. Яна будзе рэалізоўвацца ў два этапы. На першым (з 2018-га да 2020 года) будзе сфарміравана заканадаўчая база і праведзена арганізацыйная работа па ўкараненні новых элементаў сістэмы кваліфікацый. На другім этапе (з 2021-га да 2025 года) гэтыя новыя элементы ўкараняць у сферу працы і адукацыі, распрацуюць Нацыянальную рамку кваліфікацый, сфарміруюць сістэму незалежнай ацэнкі кваліфікацыі і сертыфікацыі. Каардынаваць усю дзейнасць будзе спецыяльны савет пры Савеце Міністраў.

Механізм наступны. Пры ведамствах створаць сектаральныя саветы, куды ўвойдуць і спецыялісты органаў дзяржкіравання, і прадстаўнікі перадавых прадпрыемстваў, прафесійных аб'яднанняў (такія саветы ўжо ёсць пры Дзяржаўным камітэце па маёмасці, адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій, міністэрствах эканомікі, прамысловасці, архітэктуры і будаўніцтва). Яны будуць распрацоўваць праекты прафесійных стандартаў на пэўныя віды дзейнасці, якія палічаць перспектыўнымі і найбольш запатрабаванымі. Потым іх зацвярджае Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, а Мінадукацыі на іх падставе распрацоўвае адукацыйныя стандарты для падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў.

— Для сістэмы прафесійнага навучання гэта надзвычай важна. У адрозненне ад акадэмічнай вышэйшай адукацыі, дзе большую ролю іграюць фундаментальныя веды, прыкладныя кваліфікацыі завязаны непасрэдна на тэхналогіях, выкананні задач у рамках сучасных вытворчасцяў. Гэтыя патрабаванні павінны знаходзіць адлюстраванне ў прафесійных стандартах, дзе праз апісанне відаў дзейнасці, функцый можна ўбачыць, да чаго рыхтаваць будучага спецыяліста, — адзначае **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ.**

Найбольшы разрыў паміж навучальнымі праграмамі і патрэбамі рынку працы назіраецца ў сферах, якія хутка развіваюцца, — IT, робататэхніка, лагістыка. Але, заўважае Валерый Галубоўскі, ёсць прыклады і на ўзроўні звычайных рабочых прафесій. Так, сучасны зваршчык павінен умець праграмаваць робататэхнічныя комплексы. Таму найбольш прарыўныя прадпрыемствы павінны вызначаць патрабаванні, якія пакладуць у аснову сістэмы падрыхтоўкі кадраў.

Яшчэ адзін важны момант датычыцца нефармальнай адукацыі. Яна таксама будзе мець вагу пры ўладкаванні на работу. Створаць незалежны орган, які будзе ацэньваць навыкі чалавека па пэўнай спецыялізацыі і выдаваць сертыфікат. Напрыклад, калі вы самастойна навучыліся класці печ ці асвоілі праграмаванне на анлайн-курсах, то, паспяхова здаўшы экзамен у гэтым незалежным органе, вы атрымаеце афіцыйны дакумент, які пацвердзіць вашу кваліфікацыю.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

Вучэнні

## Прыступіць да ліквідацыі наступстваў...

**У Маладзечанскім раёне прайшлі тактыка-спецыялізаваныя вучэнні з удзелам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Правяралася дзейнасць Мінскай абласной падсістэмы Дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый у халодную пару года.**

Легенда вучэнняў прадугледжвала адпрацоўку ліквідацыі наступстваў затору на дарозе з-за завеі, расчыстку завалаў на трасе праходжання лініі электраперадачы. У вёсцы Краснае аднаўлялася цеплазабеспячэнне на той выпадак, калі будзе парушана работа кацельнай. Была ліквідавана надзвычайная сітуацыя на чыгуначнай станцыі з удзелам вагона з радыеактыўнымі матэрыяламі. З аднаго з маладзечанскіх шматпавярховікаў прайшла вучэбная эвакуацыя.

За ходам вучэнняў назіраў **віцэ-прэм'ер Уладзімір КУХАРАЎ,** які знаходзіўся ў складзе штаба ліквідацыі надзвычайных сітуацый. Ён адзначыў добрае ўзаемадзеянне ўсіх экстранных службаў, якія былі на іх задзейнічаны.

— Мы робім гэтыя вучэнні для таго, каб рэальна ўбачыць магчымасці службаў і недахопы, якія неабходна аператыўна выпраўляць, — сказаў віцэ-прэм'ер. — Так, па шэрагу кірункаў мы зоймемся пытаннямі на паглыбленым узроўні. Гэта датычыцца ачысткі лясоў уздоўж ліній электраперадачы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ЧАЛАВЕК ЗЯМЛІ

## І прыродзе патрэбна перадышка

**— Ніна Вікенцьеўна, ці адчуваецца перадсвяточны настрой?**

— Мне здаецца, што праца аграрыяў сама па сабе святочная. Выходзіш у поле, калі пачынаецца пасяўная — вясна, сонца, адраджаецца зямля, і ты ажываеш разам з ёй. Цвіце канюшына — прыгажосць, ад якой не адвесці вачэй. Радасць ад еднасці з прыродай адчувае кожны, толькі ў рознай ступені. Яе немагчыма нічым замяніць. Для мяне заўсёды час асаблівага ўнутранага ўздыму, калі красуе жыта...

Невыпадкова асноўным земляробчым святам у нашых прадзедаў была Сёмуха (Тройца) — па заканчэнні вясновых палявых работ. Яго яшчэ называлі Зельна, Зелянец, Зялёныя святкі, бо выпадала на перыяд расцвітання ўсёй прыроды.

Мы, дарэчы, у «Азярыцкім-Агра» падтрымліваем народную традыцыю — на Тройцу робім выхадны дзень і амаль усім калектывам з сем'ямі збіраемся на тэрыторыі нашага аздараўленчага цэнтра «Сасновая» з песнямі, танцамі, юшкай, шашлыкамі, ушаноўваем кожнага сумленнага працаўніка незалежна ад прафесіі.

Прафесійнае наша свята выпадае на лістапад. Безумоўна, прыемна атрымліваць віншаванні. Напярэдадні віншуем усіх работнікаў сваёй гаспадаркі ў працоўных падраздзяленнях, кожнаму асабіста ўручаем шчодры «харчовы кошык» і абавязкова ладзім невялікі самадзейны канцэрт для настрою.

**— З чым падышлі да трэцяй нядзелі лістапада сёлета? Год для аграрыяў быў цяжкі.**

— Так, у параўнанні з папярэднімі гадамі не дабралі валавы аб'ём прадукцыі. Але не лічу гэта катастрофай. Год на год не прыходзіцца. Чалавек імкнецца выканаць узятыя планы, а прырода размяркоўвае па-свойму. З пункту гледжання эканомікі мы спрацавалі добра. За дзевяць месяцаў атрымалі 2 мільёны 433 тысячы рублёў прыбытку. Гэта галоўны вынік нашай работы. Часткова аднавілі свой сельскагаспадарчы тэхнічны парк, як па лізінгу, так і за ўласныя сродкі. Своечасова выплачваем заробкі (сярэдні за дзевяць месяцаў па гаспадарцы — 1130 рублёў) і падаткі, не маем доўгу за энерганосьбіты, разлічваемся з пастаўшчыкамі. Гэта справа гонару. На мой погляд, «неразлікі» — непавага да партнёра. З намі, на жаль, калегі, каго мы выручылі ў свой час кармамі, зернем, бульбай, не разлічыліся.

Справай гонару, лічу, таксама быць прафесіяналам і рабіць работу па-гаспадарску, як для сябе, незалежна ад маёмасці. У гэтым сакрэт поспеху.

Увогуле, лічу, што любы год, калі не было пажару, залевы, буры і вайны, — не цяжкі. За ўсё дзякуй Богу!

## Важней за надвор'е

**— Пра сакрэт поспеху трошкі падрабязней, калі ласка!**

— Мы, беларусы, па сваёй ментальнасці — людзі зямлі. Гэта значыць, павінны весці свой бізнес без мітусні, размерана, стабільна. Адна з асноўных праблем у гаспадарках — частая змена кіраўніцтва. Размова не толькі пра дырэктара ці старшыню, але пра агранома, заатэхніка, ветэрынарнага ўрача, інжынера... Які б разумны ні быў новы кіраўнік, ён не можа адразу ўхапіць усе нюансы вытворчасці, быту, характару мясцовасці, усё пралічыць. А пакуль ён унікае, калектыў не здольны працаваць з поўнай аддачай, прабуксоўвае. Катаклізмы надвор'я ў разы наносяць меншую шкоду справе, чым безуладдзе. Бо пры добрым кіраўніку кожны ведае, што яму рабіць, мае сваю адказнасць за справу, каб ланцужок тэхналагічнага працэсу не парваўся. Падчас экстрэмальных умоў і напружанай работы ўсе мабілізуюцца.

Калі мы звозім з палёў сена, ніхто не глядзіць, што ўжо амаль поўнач. Калі ў гарачы час не хапае механізатараў, за руль садзяцца інжынеры і механікі. Таму і аўтарытэт маюць, хоць і зусім яшчэ маладыя.

Да таго ж, работа на зямлі патрабуе пераемнасці пакаленняў. Нездарма ў сялянскіх сем'ях асаблівая пашана была старэйшаму мужчыну ў родзе. Ён ужо не меў сіл араць або малаціць, але кіраваў, быў галоўным «менеджарам». Бо ведаў, адкуль пачынаць касіць, у якую пару сеяць ці саджаць, якую жывёлу лепш пакінуць на племя. Ад яго навучаўся сын, ад таго — унук. І калі перарваць гэты ланцужок, памылкі непазбежныя.

У нас Іван Тарасавіч Ракіцкі працуе кіроўцам 53 гады. Неяк бачу: сапсавалася машына, ён стаіць і пільна сочыць, як яго ўнукі, адзін інжынер, другі ў той час быў энергетыкам у гаспадарцы, круцяць, рамантуюць, ажно галовы мільгаюць. «Во, — кажу, — Іван Тарасавіч, добрых сабе слесараў знайшлі». А ён адказвае з усмешкай: «Я ж ведаю, як адрамантаваць, ды ўжо спіна не гнецца, а вось ці змогуць гэтыя спецыялісты, пагляджу...» Змаглі. Старэйшы ўнук Сяргей Савіцкі зараз галоўны інжынер гаспадаркі, па неабходнасці замяшчае дырэктара.

А з працавітай, дыхтоўнай сям'і Валерыя Адамавіча Быстрыкі на работу ў жывёлагадоўлю разам з ім ідуць: жонка, двое сыноў і нявестка. Сям'і Тацціяны Крэс (абое з мужам Яўгенам працуюць даярамі) часта дапамагае прыгажуня дачка Насця, прадавец крамы. Спрытная, камунікабельная, адным словам, свая. Прыемна бачыць, як крочаць разам па працы механізатары бацька і сын Міхалевічы, механізатар Уладзімір Дрозд з зяцем і сынам, тры браты Няхайчыкі...

Ёсць у поспеху і іншыя абавязковыя складнікі. Ва ўсім свеце аграпрамысловы комплекс складаецца з прыватнага бізнесу. А бізнес здольны развівацца, калі ў яго ёсць місія. Грошы — толькі сродак выканання місіі, пастаўленай мэты. Калі грошы са сродку ператвараюцца ў мэту, мы атрымліваем тупіковую сітуацыю: няма ні грошай, ні справы.

Наша мэта — забяспечыць фермы самымі прадукцыйнымі жывёламі. А гэтых жывёл — найлепшымі кармамі, умовамі ўтрымання, каб мець шмат якаснага прадукту — малака (якога, дарэчы, штодня ў гаспадарцы атрымліваем 55 тон). Нам трэба гэта малако прадаць, каб за выручаныя грошы, у першую чаргу, наладзіць добры быт тых людзей, якія тэхналагічна робяць сваю справу. І тут паўстае пытанне: чаму гаспадарка не можа прадаць атрыманы прадукт таму перапрацоўшчыку, які заплаціць большую цану і своечасова разлічыцца? Гэта, дарэчы, адна з прычын стрымлівання эканамічнага развіцця сельскай гаспадаркі.

Калі коратка, поспех — гэта ініцыятыва плюс прафесіяналізм. І не трэба баяцца памылак.

## Сельскай гаспадарцы патрэбен не лятун

**— Якія якасці вы цэніце ў работніках сяла больш за ўсё?**

— Працаздольнасць, стрэсаўстойлівасць, добразычлівасць. Прафесійныя навыкі можа набыць кожны. Я бясконца рада сённяшняму свайму калектыву, бо ўсе галоўныя пасады ў ім занялі маладыя людзі. Яны прыходзілі ў свой час практыкантамі, брыгадзірамі, а цяпер кіраўнікі, прафесіяналы сваіх галін вытворчасці. Ганаруся галоўным інжынерам Сяргеем Савіцкім, яго выдатна дапаўняюць вядучыя інжынеры Аляксандр Яўменчык і Дзмітрый Філіповіч. Вельмі задаволена адказнасцю ў рабоце галоўнага агранома Уладзіміра Лапыцькі, майстра агароднінасховішча Людмілы Бакан. Проста люблю сваіх калег — галоўнага заатэхніка Святлану Коўзан, галоўнага ветурача Дзяніса Мазуру. Нічым не ўступаюць ім Ларыса Міхневіч, Тацціяна Станкевіч, Вольга Шымановіч, Мікалай Снегур, Насця Найдзенка. Выдатныя спецыялісты сваёй справы Дзяніс і Андрэй Сняжковы, Ірына Лабанава, Іван Казлоў, Тацціяна Чыркун, Валянціна Рудзік са сваімі камандамі...

Наша гаспадарка шматпрофільная: амаль сем тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, дзевяць тысяч гектараў сельгасугоддзяў, сем тысяч пашы, восем гектараў цяпліц, агароднінасховішча, сушыльная гаспадарка, экатурызм... Усе спецыялісты працуюць у звязцы, а зладжаная работа ў камандзе — поспех любой справы.

Мая задача, як я яе бачу, арганізаваць работу так, каб селянін адчуваў сябе чалавекам: меў выхадныя дні, адпачынак у цёплы сезон, магчымасць выхоўваць дзяцей, дапамагаць бацькам і працаваць на асабістай сядзібе. Мы дабіліся гэтага ў цяпліцах, часткова на ферме, пакуль не ўдаецца ў механізацыі. А гэта ж — маладыя мужчыны, якія павінны дадаваць увагу сваім жонкам, чуць патрэбы дзяцей і бацькоў. Мы ідзём да гэтага: пастуова мяняем сельскагаспадарчую тэхніку на больш эфектыўную, у людзей будзе вызваляцца час. Але ж патрэбна яшчэ і заробак захаваць.

Бо людзі, якія працуюць на зямлі, не толькі сябе — увесь свет кормяць. Іх здароўе і жыццё берагчы трэба.



Сімвалічны каравай «Азярыцкага-Агра» трымаюць галоўны інжынер Сяргей САВІЦКІ, першы намеснік дырэктара Алег ЖАЛЯЗНОЎ і галоўны аграном Уладзімір ЛАПЫЦЬКА.

**— Чым вы моладзь утрымліваеце?**

— Асаблівa і не ўтрымліваю. Калі нехта хоча сысці, ніколі не ўгаворваю застацца. Людзі мяняюць месца работы: горад блізка, а там можна знайсці больш лёгкую працу, у больш камфортных умовах. З іншага боку, для нас наяўнасць сталіцы побач — вялікі плюс. Гэта займае вольны час людзей. Добрыя транспартныя зносіны дазваляюць змяніць абстаноўку, развеяцца, адпачыць, наведаць магазіны.

Некаторыя сыходзяць у слабейшыя гаспадаркі дзеля кар'ернага росту. Розныя прычыны, у тым ліку і сямейныя.

Але ведаеце, моладзь трэба толькі зачапіць, а там яна і сама будзе падцягвацца. Сёлета мы прынялі двух выпускнікоў-ветурачоў, выпуску яшчэ двух чакаем. Справа ў тым, што вёска — гэта асаблівы свет, краіна ў краіне. У кожнай свой лад, свае звычкі, святы. Людзі адчуваюць сувязь паміж сабой, узаемную адказнасць і салідарнасць.

Разам з тым, я думаю, што сяло саспела для наступнага кроку ў вырашэнні кадравага пытання. Жыллё для спецыялістаў усіх узроўняў, якое дазволена пасля сямі гадоў працы выкупляць, ужо не рашэнне. Бо будаваліся гэтыя дамы ў свой час не заўсёды якасна, і самае галоўнае, тыя, хто іх будаваў, рабіў гэта не для сябе.

Лічу, трэба пасля пэўнай адпрацоўкі — трох-пяці гадоў, даць маладому спецыялісту ўчастак зямлі для індывідуальнага будаўніцтва і льготны крэдыт. Не гаспадарцы крэдыт, а персанальна чалавеку. Няхай ён сабе будуе дом, які жадае, і, калі можа, дадае ўласныя сродкі. А ў гаспадарцы павінна быць эфектыўная вытворчасць, каб чалавек меў магчымасць вяртаць крэдыт і паляпшаць свой дабрабыт. Вось такі падыход затрымае, дазволіць пусціць карані. Прывезці ў пабудаваны на свой густ дом старых бацькоў. Гадаваць там праз гады ўласных унукаў. Гэта важна. Нашай вёсцы неабходна аседласць. Селянін ніколі лёгка не расстанецца са сваёй маёмасцю. Гэта аснова яго жыцця.

**— Як работа ў парламенце ўплывае на кіраванне гаспадаркай?**

— Работа ў Савеце Рэспублікі дапамагае максімальна аддаць свой патэнцыял на карысць краіны. Безумоўна, гэта вялікая дадатковая нагрузка, разам з тым я рада, што маю магчымасць прадстаўляць свой рэгіён ва ўладзе і данесці пытанні тых, кім дэлегавана, да самага высокага дзяржаўнага ўзроўню. Мне ўдалося сфармуляваць 16 прапаноў для нашага заканадаўства. Некаторыя прапановы ўжо ўлічаны.

Карыстаючыся магчымасцю, хачу павіншаваць усіх аграрыяў і нашых паважаных сумежнікаў са святам. Дай Бог Вам здароўя, натхнення да жыцця і працы!

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*P.S. Калектыў «Азярыцкага-Агра» таксама віншуе свайго кіраўніка Ніну ЖАЛЯЗНОВУ з Днём работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці. Калектыў жадае Ніне Вікенцьеўне здароўя, сіл, радасці ад агульных поспехаў і дасягненняў!*

Палі «Азярыцкага-Агра».



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З нагоды

# «САЛДАТЫ» ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ

## У нядзелю сваё прафесійнае свята адзначаюць работнікі сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці

**Сёння гэта свята аб'ядноўвае амаль 300 тысяч чалавек. І ў час блокчэйну і крыптавалюты работа жывёлаводаў і камбайнераў не губляе сваёй значнасці. Адзін аграрый дае працу сямі-васьмі іншым людзям, бо проста ўбраць збожжа недастаткова, каб атрымаць духмяны, свежы хлеб.**

Прафесійнае свята для спецыялістаў — час падвядзення вынікаў і агляду здабыткаў галіны. Па даных Белстата, у краіне існуе больш за 1300 сельскагаспадарчых арганізацый, у лідарах Мінская вобласць (357 прадпрыемстваў). Больш за 70 % — гэта прыватная ўласнасць (у тым ліку з удзелам дзяржаўнага капіталу).

Палова аграрыяў мае вышэйшую, спецыялізаваную або прафесійна-тэхнічную адукацыю. Амаль 16 % занятых у сельскай гаспадарцы — гэта моладзь ва ўзросце да 30 гадоў.

Згодна з міжнароднымі ацэнкамі ўзроўню харчовай бяспекі, наша рэспубліка характарызуецца як краіна са спрыяльным асяроддзем.

Па словах намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігара Брыло, «з 2010 года харчовая бяспека нашай краіны гарантуецца ў поўнай меры». Пры гэтым вытворчасць малака больш чым у два разы перавышае патрэбы грамадзян. За 2017 год узровень самазабеспячэння малаком склаў 235 %, мясам — 136 %, яйкамі — 130 %, агароднінай — 105 %. Колькасць сельскагаспадарчай прадукцыі на чалавека ў Беларусі значна перавышае гэты паказчык у іншых краінах СНД. У мінулым годзе на душу насельніцтва прыпадала 675 кг бульбы (у Расіі — 201 кг, Казахстане — 197 кг), 127 кг мяса (у Расіі — 71 кг, Казахстане — 56 кг).

Высокі ўзровень вытворчасці і павышэнне экспарту дапамагла забяспечыць палітыка, накіраваная на мадэрнізацыю аграрнага сектара. У мінулым годзе экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання склаў без малога пяць мільярдаў долараў ЗША. За дзевяць месяцаў гэтага года колькасць замежных партнёраў павялічылася да 92 краін пры аб'ёме экспарту 3,8 мільярда долараў ЗША.

Асноўным партнёрам для Беларусі з'яўляецца Расія — амаль 79 % прадукцыі пастаўляецца ў Саюзную дзяржаву.

Сёння спецыялісты знаходзяць новыя шляхі, па якіх пацякуць нашы «малочныя рэкі». Нарошчванне экспарту тавараў і паслуг на рынак КНР стала ключавой тэмай Беларуска-кітайскага дзелавога форуму, які адбыўся 7 лістапада ў Шанхаі на палях першай Кітайскай міжнароднай выстаўкі імпартных тавараў і паслуг.

Гэты год стаў прарыўным у беларускім экспарце ў Кітай. За восем месяцаў наш экспарт у КНР вырас на 18 %. Скачок забяспечаны за кошт росту продажу прадуктаў харчавання ў пяць разоў, у тым ліку экспарту малочнай прадукцыі — у дзевяць разоў.

Нягледзячы на здабыткі нашых спецыялістаў, спыняцца не варта. Працы над якасцю тавараў патрабуе і глабалізацыя, і падрыхтоўка ўступлення краіны ў Сусветную гандлёвую арганізацыю.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Вандроўкі з сяброўкай

# Паміж Бобрыцай і Шчыбатам...

## Шыкоўны пляж, лячэнне без выхадных і радонавыя ванны

**«А я люблю ваенных, прыгожых, здаравенных», — пелі мы ўсю дарогу да Лепельскага ваеннага санаторыя, мяркуючы, што большая частка тых, хто там адпачывае, абавязкова будуць мужчыны ў форме. Аказалася — наадварот: жорсткая канкурэнцыя за ўвагу нешматлікага дужага полу. Мы з Валерыяй, прадстаўніцай тураператара «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму» ледзьве ўпільнавалі нашых фота- і відэамайстроў Сашу ды Алега, каб вечарам вярнуцца дахаты першапачатковым складам. А калі сур'ёзна, то за дзень у здраўніцы мы падрыхтавалі арганізм да зімы, пакачаліся на пляжы і нават упрыгожыліся.**




### Купанне ў мінералцы, лакальная замарозка і галаінгаляцыя

Адразу па прыездзе нас узважылі, абмералі і падабралі шэраг працэдур, якія падыдуць нашым арганізмам. Так тут падыходзяць да кожнага наведвальніка. Ніводную паслугу кліент не атрымае, калі яна, на думку ўрачоў, нашкодзіць здароўю чалавека.

На пачатку нашага медыцынскага вояжу Валерыі дасталася радонавая ванна, а мне — мінеральная. Вада была настолькі салёная, што тулава проста ўздымалася з яе. Аказалася, гэта не дзіўна, бо яна на 42 % мінералізаваная, кажуць, добра супакойвае нервы. А вось у Валерыі пасля ванны адразу перастаў балець локаць, на які яна ўсю дарогу скардзілася. Лепельскі санаторый, дарэчы, адзін з чатырох на ўсю Беларусь, які мае сваю лабараторную базу па радоне.

Пра лячэбнае ўздзеянне радону адпачывальнікі тут кажуць так: «Бывае, ледзьве прыйдзеш сюды, а напрыканцы ўжо проста пырхаеш. А эфекту хапае на год».

А мы з сяброўкай пайшлі на галаінгаляцыю, каб прачысціць лёгкія. Сядзіш сабе, дыхаеш, а імунітэт узмацняецца. Кажуць, пасля 14 такіх уздзеянняў дзеці перастаюць хварэць.

— Усе лячэбныя падраздзяленні працуюць у санаторыі сем дзён на тыдзень. Гэта значыць, што колькасць працэдур не скарачаецца прапарцыянальна дням знаходжання тут, — гаворыць **Міхаіл ЛЯХ, начальнік Лепельскага ваеннага санаторыя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.** — Раней людзі адпачывалі 18—21 дзень, сёння прыязджаюць максімум на два тыдні. І за гэты час яны павінны атрымаць не менш за восемдзесят працэдур, назначаных урачом.



### Прыгажосць, гразі і тэрэнкур

Цэны ў санаторыі не мяняліся, кажуць, апошнія два гады. І магчымасць бюджэтнага адпачынку на ўзроўні з якасным лячэннем — яшчэ адна прычына, якая вабіць сюды людзей.



Мы з Валерыяй, вядома, вырашылі скарыстацца такой магчымасцю і, хоць касметычныя працэдуры не ўваходзілі ў нашы ўрачэбныя прадпісанні, спакусіліся на манікюр за 4,5 рубля. Тым больш што за 50 капеек яшчэ і малюнак на пазногці можна зрабіць.

У міжсезонне, з 1 верасня па 1 красавіка, у санаторыі для беларусаў стварылі зніжкі да 20 %. А пасля Каляд да канца лютага — на 10 % менш плацяць усе пенсіянеры.

Кошт, дарэчы, аднолькавы і для сваіх турыстаў, і для замежных, бо як лічаць тут «усе аднымі і тымі ж гразямі ды мінералкай лечацца». А калі ў чалавека не атрымалася трапіць на працэдуру па графіку, яе стараюцца перанесці на іншы час, каб не згубіць у лячэнні.

— Радуе, што ў санаторыі часцей сталі ездзіць беларусы з дзецьмі, і лепельскі ў гэтым плане не выключэнне. Людзі разумеюць, што калі не будзе здароўя, то не будзе і сіл зарабляць грошы. Тыя, хто мае машыну, ведаюць, што павінны штогод праходзіць тэхагляд і пастаянна сачыць за яе станам, каб яна ездзіла. Вось і здароўю патрэбны такі догляд і «тэхагляд». Арганізму неабходна адпачыць, прайсці дыягностыку, аздаравіцца, пахадзіць на масажы, папіць вітаміны, — мяркуе **Вольга ШУПО, начальнік санаторна-курортнага аддзела прадпрыемства «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму», кіраўнік праекта sanatorii.by.** — І людзі пакрысе прыходзяць да гэтага разумення.

Не абмінулі мы і сапрапелевыя гразі — паляжалі захутаныя, нібы ў кокане, пагрэліся. Напапатку нават прыпякала крыху, здаецца. А памыўшыся, адчулі, нібы і сапраўды крыху пахудзелі.

Апошнім чынам вырашылі аздаравіць рытынастымуляцыяй зрок. Дзякуючы гэтай працэдуры, калі ты сядзіш і па чатыры хвіліны кожным вокам глядзіш, як мігцяць каляровыя ліхтарыкі, можна падрыхтаваць вочы да ветру і марозу, каб яны не слязіліся. Нас запэўнілі, што хапае надоўга. І сапраўды, хоць наведвалі мы санаторый яшчэ ў верасні, лістападаўскі пранізлівы вецер цяпер зусім не страшны.

Прагуляцца па тэрыторыі можна трыма спецыяльнымі маршрутамі для лячэбнай хадзьбы — тэрэнкуру: на 500 метраў, два кіламетры, а для самых заўзятых — чатыры. Мы выбралі самы кароткі шлях, каб хутчэй трапіць на пляж. Ён аказаўся хіба што не самым лепшым з пабачаных намі. А яшчэ чысцюткая вада, у якой відаць, як на дне калышуцца водарасці. Гэта тлумачыцца тым, што Бобрыца і Шчыбат — азёры, на перашыйку паміж якімі знаходзіцца санаторый, — бяруць свае вытокі з балот. Што і казаць, пакідаць гэтае месца было цяжка. Хацелася проста качацца на пясочку, назіраць за велічнымі лебедзямі і рэлаксаваць.



Аднак, як і ў любога падарожжа, у нашага таксама быў канец. Задаволеныя, мы з сяброўкай надумалі наступным разам далучыцца да аглядай экскурсіі па Мінску. Цікава ж, чым могуць здзівіць карэнных жыхароў і чаго мы не заўважаем у родным горадзе.

**Ірына СІДАРОК.**




**«Лепельский военный санаторий»**
**кардиология, ортопедия, гастроэнтерология, гинекология, неврология, пульмунология.**
**Лечение и отдых всей семьей.**
**Медицинская база работает без выходных.**
Витебская обл., Лепельский р-н, д. Боровка, lepelsan1@yandex.by.
Интернет-сайт: lepelsan.by.
**Тел./факс отдела реализации путевок:**
8 (02132) 6-42-02, (01), (03) – для граждан Беларуси.
8-10-375 (2132) 6-42-02 (01), (03) – для иностранных граждан.
GSM +375 29 332-81-75, +375 29 812-81-75. УНП 300039931.
**С 9 января по 28 февраля – всем пенсионерам скидка 10 %.**

Беларускі тураператар «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму»
Паводле «Дачкі» спадзявацца не выпадае не толькі на сістэму, што не падладжана пад асобу, прынамсі эмацыянальна не супадае са станам тых, каго абслугоўвае (хоць і сістэму па-ранейшаму прадстаўляюць жывыя людзі), але і на грамадства ў цэлым. Прадстаўнікі школы, уладальнік дома, дзе адбылася вечарына, сяброўка Камілы — усе толькі хаваюцца і раздражняюцца ад сітуацыі і таго факту, што нехта хоча дамагчыся справядлівасці, наколькі гэта магчыма, рашэння.

У выніку «Дачка» прапануе прадказальны, але самы лагічны фінал (і ручаюся, вы атрымаеце ад яго тайнае задавальненне). Канешне, ігнараванне і няздольнасць навакольнага свету дапамагчы «маленькаму чалавеку» прымушаюць яго дамагацца справядлівага пакарання сваімі метадамі. І робіць ён гэта ў падземцы — як толькі на экране аказваецца пешаходны пераход з агідным жоўтым асвятленнем, усё становіцца ясна (пасля «Незваротнасці» Гаспара Наэ тут увогуле не можа ўзнікаць іншых, апроч пагражальных, асацыяцый).

Праз статычныя планы, разбітага ў афіцыйных установах і кабінетах на фоне пустой бальнічнай сцяны/гадзінніка/герба бацьку, трагічную маўклівасць Камілы, раздражнёныя галасы прадстаўнікоў наваколля карціна паказвае адзіноту чалавека ў сваёй бядзе. Ёсць тут і смешная спроба спадара Вайцяхоўскага запрасіць дачку ў заапарк, пасля чаго яе ванітуе, бо яна цяжарная і заапарк тут недарэчы. І сацыяльныя сеткі, што сталі трыбунай для насмешак і жорсткасці сучаснай моладзі. І бязглуздая напорыстасць жанчыны, што распытвае ў Камілы пра палавы акт, і іншае-іншае.

Аўтарка прадумала сваю «Дачку», звязала планы паміж сабой нябачнымі ніцямі, шматзначна абыграла асобныя сцэны, унесла сэнс як у апавяданне, так і ў візуальную частку і атрымала арганічную, як кажуць, моцную ў прафесійным плане работу. Добры старт, пераможца Нацыянальнага конкурсу (але ж і конкурс быў не драконаўскі), жаданне казаць пра сур'ёзныя рэчы — пасля «Дачкі» павінна быць нешта большае. Нешта не проста прафесійнае.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

Нефестывальнае кіно

# ХТО ЁСЦЬ ХТО

## Інтрыга беларуска-небеларускага фільма

**Беларускія кінатэатры гэтымі днямі паказваюць «першы беларускі псіхалагічны трылер» з адсылкамі да Рамана Паланскі і Андрэя Звягінцава. Фільм «Унутры сябе» Сяргея Талыбава з Паўлам Харланчуком у галоўнай ролі — у яго стварэнні задзейнічаны, можна сказаць, «сок» беларускай кінематаграфіі — расказвае гісторыю моднага фатографа, якому быццам прымроілася забойства. Праект, калі ён яшчэ толькі анансаваўся, называў столькі арыенціраў, што міжволі з'яўлялася асцярога, ці не стане карціна другаснай. Мы яе паглядзелі і можам сказаць: стала. Але ў кантэксце беларускай кінематаграфіі шмат што набывае дадатковыя значэнні.**

### Кіно

Прадзюсары — у ліку якіх небезвядомыя персоны Віктар Лабковіч і Андрэй Курэйчык, — паставілі сабе задачу зрабіць камерцыйны фільм. Адсюль жанр, форма, пазнавальныя акцёры, антуражная прыгладжанасць (абсалютнае ўхіленне ад рэальнасці), сумяшчэнне розных — камедыйнай, тамнічай, трагічнай — стылістык, што ў выніку становіцца базай для нуара, вядомыя рэжысёры ў якасці натхняльнікаў (тут табе і Хічкок, і Паланскі, і Звягінцаў). Загадкавасць, забойствы, следства, псіхалагічныя захворванні, дзіцячыя траўмы, жудасныя флэшбэкі — карацей, інтрыга і інтрыга ў квадраце.

У цэнтры сюжэта — сямейная пара Максім і Вольга. Максім (Павел Харланчук) — модны сталічны фатограф, якому пераступае тэрміновая замова зняць акно аднаго з мінскіх будынкаў для тэматычнага каталога. Ён зрываецца з месца, едзе ноччу па прызначаным адрасе і ў патрэбным акне бачыць, да таго ж і здымае, забойства. На плёнцы ў выніку ўжо ніякага акна, ніякіх людзей, тым больш злачынцаў, з чаго пачынаецца паволнае вар'яцтва галоўнага героя. Увесь гэты час — у загадках, несупадзеннях і недарэчнасцях — жонка (Вераніка Пляшкевіч), сябра (Сяргей Жбанкоў) і псіхатэрапеўт (Андрэй Карака) спрабуюць дапамагчы Максіму разабрацца ў сабе. Зборку за ўсім гэтым назірае следчы (Ігар Сігаў), і ў рэшце рэшт праз яго работу мы даведваемся, хто ёсць хто.



«Унутры сябе» дэманструе выдатнае «арыентаванне»: аўтары фільма гуляюць з кінематаграфічнымі канстантамі, выкарыстоўваюць знаёмыя жанравыя формы, спрабуюць падладзіць свой праект пад папулярнае ў масавым кіно. Дэтэктыў, нуар, псіхалагічны трылер — фільм можна назваць як заўгодна, але жанр будзе ўсё роўна ісці наперадзе ўласна кіно. А кіно будзе засланяць ці нават адмаўляць рэальны свет.

Карціна сапраўды існуе ў выключна кінематаграфічнай плоскасці. Па-першае, таму што ідавочна кіруецца камерцыйнымі задачамі і знаёмымі формамі (так, што нічога жывога не застаецца). І адпаведна — гэта падругое — наўмысна аддаляецца ад сувязі з рэальным навакольным светам, якая магла б здорава адасобіць «Унутры сябе» ад падобнага кантэнту. Не новая, не унікальная, сканструяваная з шаблонаў гісторыя адбываецца ў вельмі незнаёмым свеце — не таму, што гэты свет фантастычны, ён якраз існуе па рэальных законах фізікі, але таму што такое беларускае жыццё нам не пазнаць. У гэтым кіно яноататальна іншае, прыгладжанае і незразумелае. А з той нагоды, што аўтары запоўнілі вялікі экран адсылкамі да кінарэжысёраў і пазбавілі яго нейкай сапраўднасці (што неБеларусь, што фальшывая Францыя — падалося нават, здымак у Францыі насамрэч не было, але частка дзеяння тут адбываецца), фільм страціў магчымасць замест эрзацу, трэніроўкі на кінаформах стаць самастойным выказваннем нават у сферы камерцыйнага прадукту.

### Калякіно

Так ці інакш для беларускага кінематографа фільм накшталт «Унутры сябе» — нядрэнна скроены трылер, дзе няма традыцыйнай для нашых аўтараў неадпаведнасці жаданняў магчымасцям, — не тое каб звычайная з'ява. Хоць стаць выключнай з'явай у айчынным кіно няцяжка, чаму і выхваленне статусам «першага беларускага псіхалагічнага трылера», як пісалася ў прэс-рэлізе, выглядае камічна.

Што нетыпова, дык укладанне прыватных сродкаў — карціна здымалася без бюджэтнага фінансавання за сто тысяч долараў — у фільм у краіне, дзе здольнасць акупіцца праз бокс-офіс даволі сумнеўная. Рынак Беларусі для такіх сум усё ж маленькі, а калі таксама ўлічыць незайздросную цікавасць гледачоў да беларускага кіно, увогуле стане незразумела, як нехта адважваецца здымаць тут камерцыйны прадукт.

> **У цэлым фільм «Унутры сябе» можа падацца важным для лакальнага беларускага кінематографа, бо амаль усё, што тут здымаецца насуперак створаным умовам у кінаіндустрыі.**

Прадзюсары маюць планы на іншыя тэрыторыі, і мы жадаем ім поспехаў, але сумняваемся, што той стэрыльны кінасвет, прадстаўлены ў карціне «Унутры сябе», — правільная тактыка ў прыцягненні спачатку беларускай, а потым замежнай публікі.

І ўсё ж пры ўсёй яго другаснасці ў кантэксце кіно — ён не прапанаваў нечага выключнага і ў сваім жанры стаў сярэднім — у цэлым фільм «Унутры сябе» можа падацца важным для лакальнага беларускага кінематографа, як амаль усё, што тут здымаецца насуперак створаным умовам. Можна спадзявацца, што пасля гульняў і маніпуляванне шаблонамі аўтары прыйдуць да нечага самастойнага, хоць бы ў камерцыйных праектах. Ніхто не ведае, ці працуе гэта насамрэч, бо працэс здымак спрашчаецца і таннее, а ўсе майстры масавага і аўтарскага кіно даступныя на раз-два, але будзем думаць, што ў карціны «Унутры сябе» — важная місія чарговага кроку ў бок светлай будучыні.

Чым фільм дакладна выдатны — выкарыстаннем сваіх сіл. Акцёры, прадзюсары, рэжысёр, аператар (Аляксандр Алейнікаў), мастакі (Раман Заслонаў) нават выканаў невялікую ролю, прычым такую, якая руйнуе логіку карціны) — дзякуючы ім ствараецца бачнасць таго, што ў краіне ёсць кінасфера і яна гатова развівацца.

«Унутры сябе» — спроба сыграць у вялікае кіно, карыстаючыся іншымі прыкладамі, але маючы сярэднягa ўзроўню інтрыгу, нестыкоўкі ў сцэнарыі і наіўна разыграную крымінальную змову. Карціна захапілася жанрам псіхалагічнага трылера, але чаму з усіх псіхалагічных трылераў трэба выбраць менавіта яе, адказу пакуль няма.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «АВТО ОТ МАСТЕРКАРД. ОКТЯБРЬ»

**Организатор рекламной игры:** ЗАО «Сэлмон-Графикс»,

юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, ком. 43, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

**Рекламная игра называется «Авто от Мастеркард. Октябрь».**

Срок проведения рекламной игры: в период с 1 октября по 28 ноября 2018 года (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

Территория проведения рекламной игры: автозаправочные станции предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть», находящихся в Республике Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3379, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 10 сентября 2018 г.

В рекламной игре приняло участие 106 526 (сто шесть тысяч пятьсот двадцать шесть) физических лиц.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победитель рекламной игры «Авто от Мастеркард. Октябрь»:

| Главный приз № 1 – Volkswagen Polo Sedan Comfortline | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № п/п | № шанса | Номер карты | ФИО победителя | Населенный пункт |
| 1 | 13460 | 2000001373040 | Балтремюк Андрей Анатольевич | Минск |

Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры: (МТС – 033, Velcom – 029, Life – 025) 6 431 431, круглосуточно.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже здания основного корпуса, принадлежащего ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов» (продавец)

**Лот №1.** Здание основного корпуса с инв. № 621/С-14517, 1901 г. п. Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, п. Альба, ул. Заводская, 1/1. Назначение: здание специализированное иного назначения. Этажность – 2. Площадь – 1 322,70 кв. м. Составные части и принадлежности: целое двухэтажное кирпичное здание основного корпуса биомицина П2/к с холодной пристройкой. Начальная цена с НДС – **76 831,42** бел. руб. Задаток – **7 683,14** бел. руб. Шаг аукциона – **5 %.**

**Земельный участок** площадью **0,1541** га, кадастровый номер 624283500601000179. Целевое назначение: земельный участок для обслуживания основного корпуса биомицина. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок – в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Обременения:** 1. Статус: историко-культурная ценность (паспорт от 15.08.2013). 2. Аренда: 102,31 кв. м по 31.12.2020; – 14,70 кв. м по 31.12.2020.

**Аукцион состоится 30.11.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, полный перечень обременений, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот № 1), принадлежащего ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов», проводимом 30.11.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 28.11.2018 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Шинкевич Роман Геннадьевич, тел.: +375 (17-70) 6-20-12 (10). Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.08.2018

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Промагролизинг»

| № Лота | Описание | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Воздухонагреватель ВУ-Т-1,5. 2012 г. в. Зав. № 99 | 14 900,00 | 900,00 | 50,00 |
| 2 | Комбайн КЗС-1218-03 «Полесье-GS12». 2009 г. в. Зав. №1624 | 12 990,00 | 500,00 | 30,00 |
| 3 | Агрегат почвообрабатывающий посевной АПП 6. 2010 г. в. Зав. № 114 | 13 800,00 | 500,00 | 30,00 |
| 4 | Пресс-подборщик самоходный рулонный Dehondt. 2010 г. в. Зав. № 65 | 18 360,00 | 500,00 | 30,00 |
| 5 | Пресс-подборщик самоходный рулонный Dehondt. 2010 г. в. Зав. № 74 | 18 360,00 | 500,00 | 30,00 |
| 6 | Пресс-подборщик самоходный рулонный Dehondt. 2010 г. в. Зав. № 67 | 18 360,00 | 500,00 | 30,00 |
| 7 | Оборачиватель лент льна ООЛ-1. 2010 г. в. Зав. № 87 | 11 640,00 | 500,00 | 30,00 |

Местонахождение Лота № 1: Минская область,Держинский р-н, д. Вязынь, 2-е мостостроительное управление. Местонахождение Лотов №№ 2–7: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 29, РО «Белагросервис»

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот (Лоты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 20 (двадцати) дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота (Лотов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 800,00 (Восемьсот белорусских рублей 00 копеек) с учетом НДС 20 % за каждый Лот в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

Аукцион состоится 18.12.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «Промагролизинг», 220035, г. Минск, пр-т Победителей, 51/2-30, т. 8 (017) 334-34-35.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, помещение 9, т. 8 (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Лот №_), принадлежащего ОАО «Промагролизинг», проводимом 18.12.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 14.12.2018 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Контактное лицо для осмотра Объектов – Бахар Дмитрий Александрович – 8 (017) 203-07-23; 8 (029) 653-86-51

**• Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение о проведении 5 декабря 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)* | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена в бел. руб. без НДС | Размер задатка в бел. руб. |
| 1 | Печь мод. ДСПТ-12, год выпуска – 1991 | 4234350 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 570 000,00 | 57 000,00 |
| 2 | Печь мод. ДСПТ-12, год выпуска – 1991 | 4234351 | | 570 000,00 | 57 000,00 |
| 3 | Печь мод. ИЧКМ-16/08И-1, год выпуска – 1991 | 4234352 | | 269 000,00 | 26 900,00 |
| 4 | Печь мод. ИЧКМ-16/08И-1, год выпуска – 1991 | 4234353 | | 269 000,00 | 26 900,00 |

**Комплектация продаваемого имущества определена в соответствии с приказом генерального директора ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ» от 30.01.2018 № 65 «О реализации электропечей ДСПТ-12И1 и ИЧКМ-16/08И1».*

**Продавец имущества:** ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся 5 декабря 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 19.11.2018 по 03.12.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

## 19 декабря 2018 г. ИЗВЕЩЕНИЕ № 17-А/2018
## о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, (лет) | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Район индивидуальной жилой застройки «Красный Маяк» (участок № 160 по генплану) | 340100000008001927 | 0,0819 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Объектов газораспределительной системы, обременения: следы проведения земельных работ по устройству фундамента, строительный мусор | 99 | 6 093,36 | 200,00 | 2 774,01 |
| 2 | Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 494 по генплану) | 340100000008005733 | 0,0873 | | Ограничений в использовании не имеет, обременения: котлован, следы проведения земляных работ, наличие опалубки | 99 | 6 006,24 | 200,00 | 2 960,21 |
| 3 | По пр-ту Октября (район жилого дома № 68) | 340100000006005654 | 0,0087 | Для размещения легкотипного торгового павильона | Зона санитарной охраны водопроводных сооружений | 5 | 739,63 | 40,00 | 2 486,93 |
| 4 | По ул. Могилевской в районе строительного магазина «ОМА» | 340100000003003379 | 1,4077 | Для строительства торгово-развлекательного комплекса или объектов гостиничного назначения, или здания специализированного культурно-просветительского и зрелищного назначения, или здания специализированного общественного питания, или здания специализированного финансового назначения, или здания специализированного розничной торговли, или здания специализированного бытового обслуживания населения | Охранная зона электрических сетей, сетей и сооружений канализации, водоохранная зона рек и водоемов, сетей и сооружений теплоснабжения | 5 | 123 677,28 | 6 200,00 | 2 449,90 |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. №№ 3–6, №№ 3–14).
3. **Аукцион состоится 19 декабря 2018 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц. Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.
Необходимые документы:
4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляются в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 17 ноября по 17 декабря 2018 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6, 3–14**

**Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

Прачытаў — перадай другому *Сумесны праект газеты «Звязда» і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

# У АГНІ НЕ ЗГАРЭЛІ І Ў ВАДЗЕ НЕ ПАТАНУЛІ

## Партызанскія рукапісы — бясцэнныя сведчанні ваеннага часу

**Рукапісныя часопісы 1942—1944 гадоў, якія выпускала практычна кожнае буйное партызанскае фарміраванне ў Магілёўскай, Мінскай, Беластоцкай, Вілейскай і іншых абласцях тагачаснай Беларусі, па вялікім рахунку цяжка аднесці да друкаваных сродкаў масавай інфармацыі. Бо друкаваліся яны — на машынцы, на газетнай паперы — далёка не заўжды, пераважна вырабляліся з падручных сродкаў: кардону, шпалераў, вучнёўскіх сшыткаў у клетку ці лінейку, тканіны, каленкору, скуры, расфарбоўваліся, як правіла, уручную алоўкамі ды чарнілам. Да чытача даходзілі нерэгулярна — то кожныя некалькі тыдняў, то раз у некалькі месяцаў, а то і наогул аднаразова, бо пасля чарговай сутычкі з ворагам нікога з рэдкалегіі не заставалася ў жывых... І тым не менш партызанскія часопісы — адна з найкаштоўнейшых крыніц інфармацыі пра падзеі на акупаваных тэрыторыях, пра баявыя аперацыі, будні і святы, пра настрой, з якім людзі ішлі ў партызаны.**

Нібы ў чароўнае люстэрка глядзеў рэдактар рукапіснага часопіса «Камсамольская іскра» (1943 год, атрад «Камсамол» 1-й Мінскай партызанскай брыгады), які напісаў у звароце да чытачоў: «Праляціць час, калі-небудзь гісторык, пісьменнік або лектар, згадваючы пра партызанаў, загляне ў наш часопіс і тут знойдзе матэрыял, каб дакладна, слушна паказаць і расказаць аб тым, хто такія партызаны, як яны жылі і змагаліся за шчасце народа...»

Насамрэч некаторыя асобнікі партызанскіх часопісаў дайшлі да шырокай публікі значна раней — ужо ў лістападзе 1942 года разам з іншымі матэрыяламі, якія ўдалося сабраць і пераправіць на Вялікую зямлю, яны экспанаваліся ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве на выстаўцы «Беларусь жыве, Беларусь змагаецца, Беларусь была і будзе савецкай». У цяперашні час самая вялікая калекцыя партызанскіх рукапісных часопісаў — 248 адзінак — захоўваецца ў Мінску ў Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Супрацоўнікі музея, дарэчы, падрыхтавалі і выдалі ў выглядзе факсімільных публікацый асобныя старонкі гэтых часопісаў: у 2009 годзе выйшаў з друку альбом «Партызанскі альманах 1944—2009», а ў 2016—2018 гадах — каталогі партызанскіх рукапісных часопісаў Магілёўскай і Мінскай абласцей. Зборнікі партызанскіх часопісаў іншых рэгіёнаў таксама рыхтуюцца да друку, а знайсці, пачытаць і паглядзець ужо складзеныя можна ў чытальных залах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Акрамя таго, у фондах бібліятэкі таксама захоўваюцца некаторыя арыгіналы партызанскага друку — часопісы, улёткі, «кнігі падарункаў Радзіме» і г. д.

### Самы каштоўны дакумент

Першы нумар рукапіснага часопіса, які захаваўся ў ваенных гісторыкаў, датаваны лютым 1942 года — гэта асобнік «Народнага мсціўца», самаробны сшытак з аркушаў абгортачнай паперы і звычайнага школьнага сшытка. У выданні яго бралі ўдзел многія вопытныя газетчыкі, а рэдактарам быў палітрук Васіль Бачароў. Часопіс выходзіў у 208-м партызанскім атрадзе ў Магілёўскай вобласці.

Партызанскія часопісы — насамрэч унікальныя інфармацыйныя зборнікі, значэнне і важнасць якіх разумелі ў тым ліку іх стваральнікі і чытачы — таму гэтыя «атрадныя летапісы» бераглі нароўні з самымі каштоўнымі паперамі. Так, вядомы выпадак, калі ў маі 1944 года, адступаючы ад пераўзыходзячых сіл ворага, байцы атрада «Бальшавік» вымушаныя былі затапіць металічную скрыню з дакументамі атрада і часопісам № 1 у рацэ паміж вёскамі Прыстань і Кабылічы Пухавіцкага раёна. Калі крыху пазней атраду ўдалося вярнуцца ў гэта месца, скрыню дасталі, а часопіс прасушылі — і зноўку чыталі і перачытвалі.

Назвы літаратурна-мастацкіх партызанскіх рукапісных часопісаў часта перакліkаюцца і паўтараюцца ў розных рэгіёнах: «Чырвоны партызан», «Народны мсцівец», «За Радзіму», «Голас партызана», «Мы пераможам», «Сцяг», «Партызанская барацьба», «Удар з тылу», «Уперад», «Камсамольская іскра», «У бой за Радзіму», «Савецкі патрыёт», «Шлях партызана», «Партызан-дыверсант», «Баявыя гады»... А вось па аб'ёме і афармленні гэтыя выданні зусім розныя: вось «Мсцівец», які складаецца ўсяго з 14 старонак сшытка ў лінейку, з першай да апошняй літары акуратна напісаны і размаляваны чарнілам, а вось «Варашылавец», які выпускаў атрад імя К. Варашылава на тэрыторыі Барысаўскага і Крупскага раёнаў — на 67 старонках амаль паўсотні якасных ілюстрацый, зробленых алоўкамі і фарбамі, а вось абцягнуты дэрмацінам «Удар з тылу» — 92 старонкі, рукапісныя суседнічаюць з машынапісам; вось «Чапаевец», у выхадных даных якога не без гумару пазначана: «Партызанскія лясы, Пухавіцкі раён, студзень-люты 1944 г.», а вось цэлая падшыўка «Камсамольскай іскры» 1-й Мінскай партызанскай брыгады — на рускай і беларускай мовах, з машынапісным тэкстам і нават некалькімі фотаздымкамі. Шмат на якіх старонках сустракаюцца дэталёвыя ілюстрацыі: партрэты камандзіраў атрадаў, баявых таварышаў, народных герояў (часта аўтарамі гэтых малюнкаў з'яўляліся прафесійныя і вядомыя беларускія мастакі, у тым ліку Сафія Лі, Мікалай Гурло, Генрых Бржазоўскі і іншыя), побытавыя замалёўкі — з іх можна было даведацца, напрыклад, як выглядалі партызанскія лазні ці сталоўкі, шпіталь або захопленая ў немцаў тэхніка, выявы медаля «Партызану Вялікай Айчыннай вайны», схемы праведзеных баёў, карты мясцовасці...

### Ад «Яблычка» да Шэкспіра

Што да тэкставага напаўнення часопісаў, то пад іхнімі вокладкамі — далёка не адны толькі ідэалагічныя «агіткі» і заклікі біць ворага не шкадуючы сіл. У рукапісных выданнях многа карыснай інфармацыі як прыкладнога кшталту — тактыка і тапаграфія, урокі арыентавання на мясцовасці, санітарна-гігіенічныя парады, напрыклад, як змагацца з прастудай і кашлем або як правільна рабіць перавязкі, так і справаздачнага характару: камсамольская «дошка гонару» тых, хто вызначыўся ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі і ў мірнай працы, біяграфіі камандзіраў і палітработнікаў. Ёсць месца і для важных дакументаў накшталт партызанскай прысягі, радыёграмы ад камандуючага партызанскім рухам генерал-лейтэнанта Панцеляймона Панамарэнкі або загадаў па атрадзе, і для дайджэста навін, і для агляду падзей — на фронце, у тыле Савецкага Саюза, за мяжой. І, канешне, значная частка нумароў адведзена пад «народную творчасць» — сваімі словамі, хай не заўжды дасканала, але палка і шчыра, партызаны расказвалі, што адчуваюць, чым ганарацца, над чым плачуць, а з чаго і смяюцца. Карыкатуры, фельетоны, анекдоты, рэбусы, «партызанскія прыказкі», прыпеўкі, апавяданні, вершы, перарobленыя на новы лад вядомыя песні — адзін толькі «Яблычак» сустракаецца ў мностве варыяцый, з якімі, мабыць, весялей было ісці і ў бой, і ў работу.






Мяркуеце, у гушчары лясоў партызанам было не да высокіх матэрый? Часам сапраўды так, а часам... Вось толькі адзін з яскравых прыкладаў. У часопісе «Камсамольская іскра», які выдаваў у Чэрвеньскім раёне атрад імя камсамола 1-й Мінскай партызанскай брыгады, змяшчалася падборка памятных дат за бягучы месяц. Дык вось, у гэтай падборцы ёсць, акрамя чытання тав. Сталіным у Свярдлоўскім універсітэце лекцыі пра асновы ленінізму, даты нараджэння падарожніка і вучонага-натураліста Мікалая Пржэвальскага і смерці вялікага англійскага драматурга Уільяма Шэкспіра — з партрэтамі. Уяўляеце сабе: 1944 год, акупаваная Беларусь, і — Шэкспір! Справа ў тым, што, акрамя «народнага рупара», партызанскія часопісы выконвалі і культурна-асветніцкую функцыю, займаліся, як бы пафасна гэта ні гучала, грамадска-патрыятычным і духоўна-маральным выхаваннем людзей, якія доўгі час знаходзіліся ў паходна-баявых умовах. Напрыклад, аўтар заметкі «Гаспадарка партызана» ў часопісе «Мсцівец» (партызанская брыгада «За Советскую Белоруссию» Міншчыны) строга даводзіць: «Некаторыя партызаны завяліся такой гаспадаркай, што яму аднаму неабходная падвода, каб перавозіць яму маёмасць. Трэба запомніць кожнаму партызану, што мы жывём на ўтрыманні акружаючага нас насельніцтва і лішняе, узятае ў селяніна, крыўдзіць яго. Партызаны, якія маюць непатрэбнае, павінны аддаць таварышам, якія жывуць у нястачы, альбо вярнуць насельніцтву».

### Памяць — героям

Большасць партызанскіх злучэнняў адлюстроўвалі ў сваіх часопісах альбо друкавалі асобна вынікі баявой дзейнасці за пэўны перыяд. «Партызанскі атрад «Іскра» быў арганізаваны 3 мая 1942 года. З моманту арганізацыі да 15 кастрычніка 1943 года нашым атрадам забіта 1370 нямецкіх салдат і афіцэраў, 64 здраднікі Радзімы; пушчана пад адхон 15 варожых эшалонаў, у выніку падрываў знішчана — 16 паравозаў, 1 мотавоз, 126 вагонаў, 1 цыстэрна, на галоўнай чыгуначнай магістралі ворага падарваныя 523 рэйкі, знішчана 980 метраў праваднoй сувязі», — скрупулёзна пералічваецца ў адной з такіх справаздач. У атрадзе імя Дзяржынскага знакамітай брыгады «Дзядзькі Колі» баявыя дасягненні запісвалі ў «Кнігу падарункаў Маці Радзіме». «У раёне Студзёнка — Бычы наша група знішчыла 6 пралётаў 2-лінейнай тэлефонна-тэлеграфнай сувязі (1200 метраў). Нікіфаровіч І. І.», «Мною, Камлюком Антонам Іванавічам, як камандзірам узвода, з групай байцоў з 19 на 20 лістапада 1943 года была праведзена баявая аперацыя. На шасэйнай дарозе Барысаў — Зембін, у раёне Трасцяніца — Студзёнка, было знішчана 40 пралётаў (3200 метраў) тэлефонна-тэлеграфнай сувязі», — пералічваюць байцы. «На брыгадную дошку гонару за праяўленне храбрасці было занесена 18 партызан. Абвешчана падзяка па загадзе 12 партызанам. 183 партызаны атрымалі ганаровае права запісаць свае баявыя дасягненні ў «Кнігу падарункаў Маці Радзіме», — дадае камандзір брыгады Пётр Лапацін, ён жа «Дзядзька Коля».

Але, безумоўна, асаблівую значнасць маюць змешчаныя ў часопісах спісы загінулых таварышаў — з імёнамі і прозвішчамі, часта з партрэтамі і некаторымі біяграфічнымі звесткамі, якія дазваляюць устанавіць дакладныя месцы і абставіны гібелі.

Адзін з такіх летапісаў — «Кніга гонару камсамольцаў партызанскага атрада «Чырвоны сцяг», якія праявілі адвагу ў барацьбе з фашысцкімі вылюдкамі», — расказвае пра лёс камсамольца Сцяпана Хрэна, 1922 года нараджэння, члена ВЛКСМ з 1939 года, удзельніка партызанскага атрада з 4 жніўня 1942 года: «За час знаходжання ў партызанскім атрадзе Сцяпан праявіў сябе адданым патрыётам сваёй партыі Леніна — Сталіна, верным сынам свайго народа. Нямала фрыцаў і паліцэйскіх загінула ад агню Сцёпінага кулямёта. Падчас зімовай блакіроўкі 1943 года дзясяткі фрыцаў былі падкошаны кулямётчыкам Сцёпам. Аднак міна ворага абарвала жыццё Сцёпы. Байцы яго аддзялення пакляліся біць ворага так, як біў іх камандзір Сцяпан Сцяпанавіч. Вечная памяць загінуламу герою...» Гэтых імёнаў — дзясяткі, сотні, і за кожным стаіць боль родных і сваякоў, гнеў і гонар сяброў. А яшчэ — удзячная памяць дзяцей, унукаў і праўнукаў, маленькая часцінка вялікай Перамогі і таго самага мірнага неба, якое і сёння, праз 75 гадоў, мы не развучыліся цаніць і берагчы.




**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ПЯЦІГОДКА НА ПЯЦЬ ТРЫЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

## Як ініцыятыва Паднябеснай стала сусветным трэндам

Сёлетняя восень для Кітая шмат у чым адметная. Пяць гадоў таму старшыня КНР Сі Цзіньпін абвясціў пра ключавыя прынцыпы гістарычнай ініцыятывы адраджэння Шаўковага шляху ў сучасных умовах. Гэтая крэатыўная прапанова прагучала спачатку ў Казахстане, а пасля ў Інданезіі. Тады яна падавалася хіба што прыгожым слоганам, шмат хто сумняваўся ў магчымасці практычнай рэалізацыі такога маштабнага, насамрэч транснацыянальнага праекта, які аб'яднаў усе кантыненты. Аднак час расставіў усё па месцах. Цяпер усе прапановы, вылучаныя старшынёй КНР, знайшлі ўвасабленне ў канкрэтных справах. Што неаднойчы падкрэслілі ўдзельнікі юбілейнага V Форуму супрацоўніцтва СМІ «Адзін пояс, адзін шлях», які быў арганізаваны газетай «Жэньмінь жыбаа» разам з Цэнтральным камітэтам Камуністычнай партыі Кітая і ўрадам правінцыі Хайнань. Мерапрыемствы прайшлі ў знакавым месцы — сталіцы штогадовага Азіяцкага форуму — пасёлку Боаа, што на ўсходнім узбярэжжы вострава Хайнань. Больш за 250 прадстаўнікоў з 90 краін і міжнародных арганізацый, 205 сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку і прадстаўнікі з Беларусі, сабраліся ў адной зале, каб разам абмеркаваць план узаемадзеяння паміж СМІ, а таксама падзяліцца думкамі аб перспектывах глабальнага праекта. Як ініцыятыва Паднябеснай стала сусветным трэндам?

### «Папяровыя» праекты

Як вядома, за апошнія дзесяцігоддзі некаторыя краіны прапаноўвалі свае канцэпцыі адраджэння Шаўковага шляху. Тут варта згадаць ідэю, агучаную яшчэ ў 1996-м японскім урадам пад назвай «Дыпламатыя Шаўковага шляху». У 1999 годзе Кангрэсам ЗША быў прыняты «The Silk Road Strategy Act», які прадугледжваў узмацненне амерыканскай дапамогі краінам Цэнтральнай Азіі і Каўказа з мэтай памяншэння ўплыву Расіі ў рэгіёне. Восенню 2011-га ЗША абнавілі сваю ініцыятыву «Новага Шаўковага шляху», якая на той час была накіравана на паляпшэнне эканамічнага становішча Афганістана з-за перакідвання энергетычных рэсурсаў Цэнтральнай Азіі на поўдзень. Пасля планавалася шляхам інтэграцыі эканомік краін рэгіёна Цэнтральнай і Паўднёвай Азіі (уключаючы Пакістан і Індыю) стварыць зону свабоднага гандлю, пабудаваць транспартныя шляхі і газаправоды з поўначы на поўдзень. Зрэшты, усе гэтыя ідэі засталіся толькі на паперы.

Некалькі ініцыятыў пад лозунгам «Шаўковага шляху» абвяшчалі ўрады Паўднёвай Карэі ў перыяд 2009—2013 гадоў. Усе яны мелі на мэце пракладанне шляхоў да сыравінных рэсурсаў кантынента, у прыватнасці ў Цэнтральнай Азіі, і ўзмацненне прысутнасці ў рэгіёне карэйскага бізнесу. Пасля шмат гаварылася пра тое, што Японія, Індыя, Аўстралія і ЗША сумесна будуць ствараць свой «альтэрнатыўны» Шаўковы шлях — «Калідор росту Азія—Афрыка». Як дэкларавалася, яго прынцыповым адрозненнем ад кітайскай ініцыятывы з'яўляецца тое, што ён будзе арыентаваны на раскрыццё магчымасцяў супрацоўніцтва прыватнага сектара і спрыяць прыцягненню інвестыцый на рынкі, якія развіваюцца.

Як заўважаюць эксперты, цяпер лёгка пераканацца, што ні адна з гэтых ініцыятыў не насіла ўніверсальнага характару і не мела комплекснага падыходу. Філасофія кожнага з такіх праектаў абмяжоўваецца тым, што адна ці некалькі «краін-заснавальніц» атрымаюць пэўную выгаду ад уласнага доступу да танных рэсурсаў краін, якія развіваюцца.



### Пяць кірункаў

Кітайская ініцыятыва першапачаткова грунтавалася на іншых прынцыпах. Старшыня КНР у 2013 годзе адразу прапанаваў пяць ключавых кірункаў, па якіх могуць быць рэалізаваны сумесныя праекты ў рамках ініцыятывы «Пояса і шляху». Перш за ўсё, гэта ўзмацненне палітычных кансультацый паміж краінамі. Сі Цзіньпін прапанаваў рэгулярна праводзіць падрабязны абмен думкамі па стратэгіі і тактыцы эканамічнага развіцця. Кіруючыся прынцыпам дасягнення адзінства думак пры захаванні адрозненняў і шляхам кансультацый прадукаваць праграмы і мерапрыемствы па развіцці рэгіянальнага супрацоўніцтва, даць «зялёнае святло» для рэгіянальнай эканамічнай інтэграцыі ў палітычным і прававым плане.

Таксама было прапанавана актывізаваць развіццё адзінай транспартнай сістэмы. Старшыня КНР заявіў пра гатоўнасць Кітая актыўна разглядаць з усімі краінамі ўдасканаленне адпаведнай трансгранічнай інфраструктуры на карысць паступовага стварэння такой сеткі, якая злучае Усходнюю, Заходнюю і Паўднёвую Азію. Гэта стварае спрыяльныя ўмовы для эканамічнага развіцця і перамяшчэння грамадзян краін рэгіёнаў свету.

Гаворка вялася і пра ўзмацненне гандлёвых сувязяў. У эканамічнай палассе Шаўковага шляху пражывае звыш трох мільярдаў чалавек, гэта велізарныя рынкі. Відавочна, што гандлёва-інвестыцыйнае супрацоўніцтва мае вялікі патэнцыял. Мэтазгодна шукаць адэкватныя схемы спрашчэння ўмоў для гандлю і інвестыцый, працаваць над ліквідацыяй гандлёвых бар'ераў, зніжэннем непатрэбных выдаткаў, павышэннем хуткасці і якасці эканамічных аперацый.

Лагічна меркавалася павелічэнне разлікаў у нацыянальных валютах. Кітай прапанаваў актыўна пераходзіць да такой схемы. Гэта правільны крок, паколькі пераход да нацыянальных валют пры абменах і разліках у бягучых і капітальных аперацыях здольны значна знізіць выдаткі на грашовыя аперацыі, умацаваць фінансавыя сістэмы краін, прадухіліць фінансавыя рызыкі, павысіць міжнародную канкурэнтаздольнасць рэгіянальнай эканомікі.

Яшчэ адзін важкі аргумент — узмацненне сувязяў на ўзроўні людзей. Міждзяржаўныя адносіны будуюцца на ўзаемнай дружбе народаў. Для таго каб дамагчыся поспехаў па згаданых кірунках, неабходна абавязкова мець народную падтрымку, актывізаваць дружалюбныя кантакты народаў, умацаваць паразуменне і традыцыйнае сяброўства. Такім чынам рэгіянальнае супрацоўніцтва атрымае трывалую сацыяльную і грамадскую базу.

Такімі былі прынцыповыя падыходы кітайскага кіраўніцтва пры стварэнні ініцыятывы «Пояса і шляху». «Усё праходзіць адкрыта і празрыста. Няма ніякай дамінуючай сілы, ёсць толькі раўнапраўны ўдзел усіх бакоў. Няма ніякіх цёмных спраў, ёсць толькі адкрытасць і транспарэнтнасць. Няма прынцыпу «пераможца забірае ўсё», ёсць імкненне да ўзаемнай выгады і сумеснага выйгрышу», — так акрэсліў прынцыповыя падыходы Кітая міністр замежных спраў КНР Ван І.

Для ўвасаблення глабальных праектаў пры Дзяржаўным камітэце па развіцці і рэформе была арганізавана кіраўнічая канцылярыя. Адкрыўся Азіяцкі банк інфраструктурных інвестыцый. Таксама на чале з кітайскім урадам быў створаны Сумесны інвестыцыйны фонд. За пяць гадоў рэалізацыі ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» Кітай падпісаў 103 дакументы аб супрацоўніцтве з 88 краінамі і міжнароднымі арганізацыямі. Сукупны гандлёвы абарот Кітая з краінамі ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» перавысіў пяць трыльёнаў долараў, сукупны аб'ём інвестыцый Кітая ў краіны, ахопленыя ініцыятывай, перавысіў 70 мільярдаў долараў. Кітайскія прадпрыемствы адкрылі 75 зон гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў краінах ініцыятывы, якія забяспечылі 200 тысяч новых рабочых месцаў. Бакі сумесна выпрацавалі новую мадэль супрацоўніцтва для развіцця глабальнай эканомікі і рэгіянальнай інтэграцыі.

«Вылучаная Кітаем ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» падала важную платформу для прасоўвання міжнароднага супрацоўніцтва, прапанавала новае мысленне», — адзначаў Генсакратар ААН Антоніу Гутэрэш. Ён падкрэсліваў, што гэтая стратэгія дазволіла запусціць новыя інфраструктурныя праекты, прыцягнуць інвестыцыі ў краіны, якія развіваюцца, і знізіць беспрацоўе. «Будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху» ўяўляецца ўзаемавыгадным і выйгрышным для ўсіх бакоў», — заўважыў Гутэрэш.

### Без бар'ераў

Кітайская ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» накіравана на ўсеагульнае развіццё, і сёння можна ўжо казаць аб яе пераходзе на новы, больш высокі і якасны этап рэалізацыі. Такое меркаванне выказаў на форуме супрацоўніцтва СМІ кіраўнік газеты «Жэньмінь жыбаа» Лі Баашань. «Цяпер перад чалавецтвам стаяць сур'ёзныя выклікі. Эфектыўныя адказы на іх можна знайсці толькі сумеснымі намаганнямі. Нам уяўляецца, што ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» якраз можа прапанаваць мадэль рашэнняў для многіх праблем сучаснасці, садзейнічаць падтрыманню міру і пашырэнню глабальнай кааперацыі», — заявіў Лі Баашань. Па яго словах, важнай асаблівасцю гэтага маштабнага праекта з'яўляецца той факт, што ён улічвае інтарэсы краін, якія развіваюцца, а не арыентаваны выключна на вядучыя эканомікі планеты.

Гаворачы аб знешняй палітыцы Кітая, Лі Баашань падкрэсліў, што КНР за апошнія гады ўнесла значны ўклад у падтрыманне стабільнасці ў рэгіёне і свеце. «Кітай не будуе бар'еры і перашкоды для іншых краін, ён выступае супраць прымянення сілы і вітае ўзаемадзеянне ва ўсіх сферах, — заўважыў Лі Баашань. — Тут важна адзначыць, што ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» рэалізуецца ў адпаведнасці з існуючымі міжнароднымі правіламі. Не выключана, што з часам мы прыйдзем да высновы аб неабходнасці ўдасканалення міжнароднай прававой сістэмы, але гэта павінна быць натуральная эвалюцыя на аб'ектыўнай і празрыстай аснове».

Вітаючы ўдзельнікаў форуму, Лі Баашань канстатаваў, што гэтае мерапрыемства з году ў год дэманструе дынаміку і знаходзіць падтрымку сярод многіх краін. «Наш форум — трывалая платформа для дыялогу СМІ. «Жэньмінь жыбаа» будзе заахвочваць міжнародны абмен і супрацоўніцтва, мы будзем імкнуцца ісці ў нагу з новымі плынямі ў галіне медыя і сферы інфармацыйных тэхналогій. Тэма інавацый заўсёды будзе ў фокусе нашых міжнародных сустрэч», — дадаў ён.

Як заўважыў член Палітбюро Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая Хуан Куньмін на сустрэчы з удзельнікамі форуму супрацоўніцтва СМІ, «Адзін пояс, адзін шлях», ужо ператварыўся з канцэпцыі ў дзеянне, з бачання перспектыў у рэальнасць. Ён выказаў надзею на тое, што СМІ зацікаўленых краін і рэгіёнаў будуць бесперапынна паглыбляць узаемадзеянне і актыўна распаўсюджваць інфармацыю аб ініцыятыве. Замежныя прадстаўнікі ў сваю чаргу выказалі гатоўнасць умацоўваць супрацоўніцтва паміж СМІ і тым самым унесці большы ўклад ва ўвасабленне глабальнага праекта.

Беларусь — важны партнёр Кітая ў будаўніцтве «Пояса і шляху». Гэта, дарэчы, неаднойчы падкрэсліваў старшыня КНР. «Нашым краінам варта распачаць яшчэ вялікія намаганні для ўмацавання гандлёва-інвестыцыйных адносін», — заўважыў Сі Цзіньпін. Вельмі важным тут падаецца правядзенне налета форуму «Адзін пояс, адзін шлях» на базе Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

І яшчэ. Што датычыцца менавіта ўзаемадзеяння СМІ, то паміж «Жэньмінь жыбаа» і «Звяздой» развіваецца плённае супрацоўніцтва, што замацавана ў адпаведным Мемарандуме, падпісаным рэдакцыямі. Мы рэалізуем сумесны праект, які прадстаўлены на нашых інтэрнэт-парталах (на сайце «Звязды» ён называецца «Весткі з Кітая»), а таксама на старонках выданняў. Тут адлюстроўваецца шырокая палітра жыцця Беларусі і Кітая. Адметна, што ў музеі аднаго з вядучых СМІ свету — «Жэньмінь жыбаа» адзін са стэндаў прысвечаны менавіта нашаму сумеснаму праекту.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*Мінск — Боаа — Пекін — Мінск.*



Павел ХАДАСЕВІЧ:

# «У НАС НЯМА ПРАБЛЕМ, ДЗВЕРЫ ЗАЎСЁДЫ АДЧЫНЕНЫ»

## Шчырая размова пра допінг, здароўе і псіхалогію ў цяжкай атлетыцы

**Зборная Беларусі ўпершыню пасля 2015 года выступіла на чэмпіянаце свету па цяжкай атлетыцы. Нагадаем, дыскваліфікацыю наша краіна (і яшчэ восем дзяржаў) атрымала пасля пераправеркі допінг-проб з Алімпійскіх гульняў 2008 і 2012 гадоў. На першым турніры пасля адхілення беларусы выйгралі тры медалі, «серабро» заваявалі Павел Хадасевіч і Дар'я Навумава, а на трэцюю прыступку п'едэстала падняўся Вадзім Ліхарад. Акрамя гэтага, цяперашні чэмпіянат свету стаў першым пасля таго, як былі зменены вагавыя катэгорыі. Пра тое, як адчувала сябе там наша зборная, і пра ўласную кар'еру расказаў сярэбраны прызёр чэмпіянату свету — 2018, удзельнік Алімпійскіх гульняў 2016 года ў Бразіліі Павел Хадасевіч.**

***— Павел, з якім планам вы ехалі на чэмпіянат у Ашгабат?***

— У плане на паперы было 4—6-е месца, але я ехаў з задачай мінімум заваяваць бронзавую ўзнагароду. А потым склалася так, што ўсёй камандай, якая працавала са мной, мы дайшлі і да «серабра». Задаволены сваім вынікам і вагой, якую падняў, але думаю, што можна было падняць нават больш. Што датычыцца сапернікаў, складана было вылучыць лідараў, на турніры такога ўзроўню ўсе ўдзельнікі з'яўляюцца сур'ёзнымі апанентамі. Усе паказвалі роўныя вынікі, выступленне не ўдалося, напэўна, толькі ў леташняга чэмпіёна свету з Чылі.

***— Зараз у вашай вазе (да 89 кг) канкурэнцыя сур'ёзная?***

— Спартсмены з вядомымі імёнамі трымаюцца на плаве, з'яўляюцца і новыя атлеты. Вынікі ў маёй вагавой катэгорыі досыць шчыльныя. На чэмпіянаце ў мяне ў суме была вага 371 кг, у расіяніна Арцёма Акулава — 372 кг, а далей ідуць пяць-сем спартсменаў з розніцай у пару кілаграмаў. Моцных сапернікаў дастаткова, часта ў нас на спаборніцтвах асноўную ролю адыгрывае тактыка.

***— Крыўдна было прайграць расіяніну ўсяго кілаграм?***

— Крыўдна было б, калі б мне далі апошні падыход, калі я ішоў на першае месца, а я б яго не штурхнуў, а так, не, не крыўдна. Акулаў пайшоў і зрабіў тое, што яму трэба было зрабіць. Апошняе слова было за ім, у гэтым плане ён быў у больш выгадным становішчы. Нашым стратэгічным пралікам гэта таксама не назавеш, лепш пачаць з той вагі, у якой ты адчуваеш сябе ўпэўнена, і потым ужо «разганяцца».

***— У рыўку вы паднялі 169 кг, штурхнулі 202 кг. Гэтыя паказчыкі на трэніроўках даваліся вам лёгка?***

— Рывок і на спаборніцтвах ішоў добра. А на трэніроўках, бывае, прыходзіш і проста лётаеш, а на другі дзень як быццам цябе білі ўсю ноч палкамі, не заўсёды ўсё атрымліваецца. Да моманту спаборніцтваў проста падводзіш сябе, даеш сабе адпачынак, нагрузкі больш спакойныя, таму там лепш заўсёды павінна атрымлівацца, калі горш, то гэта гаворыць пра няправільны падыход да спаборніцтваў. Да таго ж на турнірах адрэналін надае сіл. Да цяперашняга чэмпіянату свету я назапасіў эмоцый, не марнаваў іх ні на што, не браў нічога пад увагу, і гэтага зараду хапіла.

***— Якую максімальную вагу вы ўздымалі на працягу года на трэніроўках?***

— 170 і 205 кг, не нашмат больш, чым цяпер на спаборніцтвах. Хоць, калісьці перад Алімпійскімі гульнямі я рваў 180 кг і штурхаў 210 кг. Тады чамусьці было лягчэй. З чым гэта звязваю? Напэўна, цяпер такі перыяд, гэта дыскваліфікацыя... Не зусім зразумела было, да чаго ты ідзеш. Толькі апошнія два месяцы настройваўся на тое, што трэба рабіць сваю справу добра і прыгожа.

***— Сёлета ў цяжкай атлетыцы змяніліся вагавыя катэгорыі. Гэта зручна асабіста для вас?***

— Раней я выступаў у катэгорыі да 85 кг, і таму часта даводзілася зганяць вагу, а з ёй, вядома, сыходзілі і сілы. Цяпер спаборнічаю ў катэгорыі да 89 кг, і гэта значна зручней для мяне.

***— У зборную вярнуўся ваш зямляк, барысаўчанін Андрэй Арамнаў...***

— Ён імкнуўся да гэтага, каля года трэніраваўся сам, дома, без трэнера, потым паказаў нядрэнны вынік і пачаў рыхтавацца са зборнай да чэмпіянату свету. Хацеў выступіць трохі лепш, але пакуль не атрымалася.

***— Гэта першы чэмпіянат свету для нашай зборнай пасля дыскваліфікацыі. З якім настроем ехала каманда і якая атмасфера была ў калектыве?***

— Хтосьці выходзіў на памост і казаў, што цяжка. У мяне такога пачуцця не было, наадварот штанга здавалася такой мяккай, зручнай, а атмасфера ў камандзе ў прынцыпе была добрая, нічога асаблівага мы не адчувалі.



***— Зразумела, што людзі, якія выступаюць цяпер, не вінаватыя ў допінгавых памылках мінулага, але ўсё ж на каманду псіхалагічна неяк гэта ўплывае?***

— У першы час гэта стварала нейкі дыскамфорт, а потым ты разумееш, што трэба прыстасоўвацца да таго, што ёсць. Так жывём і працуем. Дыскваліфікацыя закранула дзевяць камандаў, але самае галоўнае, што людзі, якія спаборнічаюць з намі зараз, усё разумеюць, мы зусім іншае пакаленне. Раней усе выступалі ў роўных умовах, а потым нешта пайшло не так, нехта захацеў, каб мы пасядзелі год дома.

***— Допінг-кантроль змяніўся, правяраць вас сталі часцей?***

— За гэты год я здаў ужо шэсць або сем проб, гэта значна больш, чым было раней. Калісь прыязджалі кожны тыдзень, калісь раз на месяц. Часам дадому ў Барысаў, часцей на зборы і трэніроўкі ў Стайкі. Гэта былі і НАДА, і ВАДА. Але ў нас няма праблем, дзверы заўсёды адчынены.

***— У канцы мая зноў адбыўся непрыемны інцыдэнт, калі тры маладыя беларускія спартсмены былі абвінавачаныя ў парушэнні антыдопінгавых правілаў. На ваш погляд, з каго трэба пытацца: з саміх спартсменаў, урачоў ці трэнераў?***

— Наколькі я зразумеў, яны ўжывалі нейкі энергетык перад трэніроўкай, проста каб неяк узбадзёрыцца, прачнуцца. Доктар дакладна тут ні пры чым, ён гэта не выдаваў. Мабыць, трэнер нешта купляў, але не прачытаў састаў. Зараз жа кожны год уводзяцца новыя забароненыя прэпараты, атрымалася так, што там быў адзін забаронены кампанент, гэта хутчэй нават проста недасведчанасць настаўніка.

***— Наогул, наколькі ваш від спорту б'е па здароўі?***

— У спорце найвышэйшых дасягненняў усё павінна рабіцца пісьменна, гэта ж не ўзровень спартшколы, дзе ўпёрся лбом і ціснеш. Напрыклад, у які-небудзь дзень я магу патэлефанаваць трэнеру і сказаць, што не прыйду на трэніроўку, бо адчуваю, што «здуўся», арганізму патрэбен адпачынак. І да гэтага трэба прыслухоўвацца.

***— Як вы аднаўляецеся пасля трэніровак, калі не ўлічваць спецыяльныя вітаміны?***

— Прагулка. Найчасцей мы знаходзімся ў Стайках, а тут добрыя краявіды. Вока цешыцца, і настрой падымаецца. Трэба ўмець пераключацца на нейкія іншыя справы, напрыклад, я тут стрыг хлопцаў. Нідзе не вучыўся, проста неяк сам. У камандзе ў нас чалавек 16—17, дзесяць з іх даклада з маімі прычоскамі.

***— Частка антыдопінгавых санкцый да нашых цяжкаатлетаў яшчэ захавалася, напрыклад, на наступныя Алімпійскія гульні — 2020 мы зможам заявіць толькі двух спартсменаў. Як будзе праходзіць барацьба за пуцёўкі?***

— Так, паехаць зможа адна жанчына і адзін мужчына. Хто адправіцца туды, будзе бачна па выніках чэмпіянатаў свету і Еўропы, якія пройдуць напярэдадні. Думаю, паедзе той, хто будзе на самым высокім узроўні, заваюе ліцэнзіі.

***— Як ацэньваеце свае шанцы?***

— Да Алімпіяды яшчэ паўтара года, ёсць спаборніцтвы, на якіх трэба выступаць, таму пакуль я думаю пра іх, а не пра Гульні.

***— У вас у актыве ўжо ёсць адна Алімпіяда, Рыа-2016, дзе вы сталі шостым, але там вы былі яшчэ досыць маладым...***

— У нашым відзе спорту хтосьці раскрываецца ў дваццаць, а хтосьці, як Стральцоў, толькі да трыццаці. Мне тады было 23, і, калі параўноўваць мяне таго з цяперашнім, зараз я адчуваю сябе нашмат больш упэўнена. Алімпіяда як падзея — гэта найлепшае, чаго можа дасягнуць спартсмен у нашым відзе, але сваім вынікам у Бразіліі я застаўся незадаволены. Тады ў мяне была пастаянная праблема з каленам, таму не зусім атрымлівалася выступаць. Але я гэта ўжо забыў і працягваю працаваць далей, прайшло ўжо шмат часу, два гады гэта больш, чым 700 дзён, і кожны з іх асобная гісторыя.

***— Чаму ў дзяцінстве вы выбралі адзін з самых складаных відаў спорту?***

— Першапачаткова я займаўся гімнастыкай, каля трох гадоў, але так атрымалася, што мой трэнер сышоў і мяне яна перастала цікавіць. Спачатку я прагульваў, а потым і зусім кінуў. Каля паўгода нічым не займаўся, а потым бабуля павяла на барацьбу, але мяне выпадкова завялі ў залу штангі. У майго першага трэнера па штанзе атрымалася зацікавіць, затрымаць мяне ў гэтым відзе спорту.

***— Адразу выбралі спорт як прафесію?***

— Не, зразумеў, што гэта маё, толькі за год да таго, як трапіў у зборную.

***— Калі Арамнаў, які таксама, як і вы, вырас у Барысаве, стаў алімпійскім чэмпіёнам, гэта вас падагравала?***

— Мы збіралі каманду з Барысава і ездзілі сустракаць яго і Рыбакова ў аэрапорт. Яны, вядома, уражвалі, памятаю дакладна, што глядзеў выступленне Андрэя на кухні, хварэў за яго, але тады гэта не было для мяне матывацыяй, напэўна, я яшчэ не разумеў, чаго хачу: на вуліцу пайсці гуляць або чагосьці дасягнуць.

***— А сёння што матывуе вас на штодзённыя трэніроўкі і пераадоленне сябе?***

— У першую чаргу тое, што выдаткавана вельмі шмат часу і ўсяго астатняга. Пакідаць спорт з пустымі рукамі абсалютна не хочацца. Спачатку трэба чагосьці дасягнуць і сысці па ўласным жаданні, а не калі цябе выганяць ці з-за траўмы. А так, каб я зразумеў для сябе, што тут сваю місію выканаў, трэба пачынаць нешта іншае.

***— Хто вас матывуе і натхняе?***

— Многія людзі, з якіх можна ўзяць прыклад. У штанзе гэта, напрыклад, Аляксандр Курловіч. Ён быў вельмі круты і моцны, прыязджаў да нас на трэніроўкі ў Стайкі, сустракаліся з ім і на спаборніцтвах. На Алімпійскіх гульнях ён сядзеў перада мной як суддзя. Вялікі спартсмен, мог стаць трохразовым алімпійскім чэмпіёнам, але з-за нечаканай траўмы не атрымалася. Ёсць яшчэ Конар Макгрэгар, які пачынаў свой шлях з ніжэйшых слаёў, але сваёй упартасцю і талентам дасягнуў таго, што ёсць у яго сёння. Гэта сведчыць аб тым, што можна нечага дасягнуць, калі не сядзець і не ныць пра тое, як усё дрэнна.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

---

MINSK 2019 2nd European Games

# СПЕЦЫЯЛЬНЫ ФАРМАТ

**Брэндзіраваную «Картку госця» для II Еўрапейскіх гульняў плануецца выпусціць да 1 снежня.**

Карткі будуць рэалізоўвацца сумесна з білетным аператарам Гульняў кампаніяй Ticketpro, яны разлічаны на 14 дзён і ўключаюць найбольш значныя аб'екты гістарычнай спадчыны Беларусі. Спецыяльная картка дазволіць сплянаваць індывідуальнае падарожжа па Мінску, Мінскай вобласці і краіне, а акрамя таго, уладальнікі такіх картак змогуць карыстацца зніжкамі і бонусамі.

Дакладны кошт «Карткі госця» на 14 дзён пакуль не называецца, але папярэдне паведамляюць, што ён будзе ў межах 30 рублёў.

Адзначым, што турыстычны праект «Картка госця» (Minsk Card. Cities & Regions of Belarus) рэалізуецца УП «Мінгардаведка» пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму, Міністэрства культуры, інфармацыйна-турыстычнага цэнтра «Мінск» па дзяржаўнай праграме развіцця турызму «Беларусь гасцінная» на 2016—2020 гады. У ім бяруць удзел музеі, галерэі, заапаркі, аквапаркі, гатэлі, рэстараны, кафэ, гандлёвыя аб'екты, пункты пракату аўтамабіляў і веласіпедаў, якія даюць бонусы і зніжкі.

Купіць «Картку госця» можна ў дзевяці пунктах продажу, а таксама анлайн. Уся інфармацыя даступная на сайце праекта на англійскай і рускай мовах, матэрыялы таксама перакладаюцца на кітайскую і нямецкую мовы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ, Сяргей КУРКАЧ.**

---

Футбол

# УСЁ ВЫРАШЫЦЦА ЗАЎТРА

**Зборная Беларусі згуляе з Сан-Марына, пасля чаго стане зразумела, ці працягне яна барацьбу за пуцёўку на Еўра-2020**

У чацвер у Лізе нацый нашы футбалісты ў гасцях абыгралі зборную Люксембурга з лікам 2:0. Галявым дублем адзначыўся паўабаронца Станіслаў Драгун. А ў другім матчы групы 2 лігі D футбалісты Малдовы з мінімальным лікам 1:0 абыгралі Сан-Марына. Такім чынам, пасля пяці тураў беларусы з 11 ачкамі ўзначальваюць групу.

Адзначым, што зараз беларусы футбалісты застаюцца адной з дзвюх камандаў у Лізе нацый, якія не прапускалі галоў у гэтым турніры. Падобным вынікам можа пахваліцца толькі каманда Даніі, якая пасля дзвюх гульняў мае баланс забітых і прапушчаных — 2:0.

Заключны матч Лігі нацый беларускія футбалісты правядуць заўтра. У выпадку перамогі наша зборная выйдзе ў плэй-оф і разам з трыма іншымі пераможцамі лігі D пазмагаецца за пуцёўку на чэмпіянат Еўропы 2020 года.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белхим» (продавец)

Лот № 1. Здание административно-бытового корпуса с инв. № 620/С-840, 1975 г. п. Адрес: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25. Назначение: здание административно-хозяйственное. Этажность – 3. Площадь – 2 132,7 кв. м. Составные части и принадлежности: целое трехэтажное здание административно-бытового корпуса из железобетонных стеновых панелей (БЗ/п). **Начальная цена** с НДС – 480 600,00 бел. руб. **Задаток** – 50 000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %.

**Обременение**: Ипотека. В случае продажи с публичных торгов имущества, являющегося предметом ипотеки, ипотека прекращается в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Земельный участок** площадью 0,3278 га, кадастровый номер 622250600001002017. Целевое назначение: для обслуживания здания административно-бытового корпуса. Право постоянного пользования. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В, площадь 0,0270 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Аукцион состоится **30.11.2018 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Белхим», проводимом 30.11.2018. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 28.11.2018 в 11.00. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.03.2018. Контактное лицо для осмотра Объекта – Диденко Дмитрий Алексеевич, тел. +375-44-581-89-49

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

Утерянные представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланки квитанций о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ с № 2432977 по № 2432980 **считать недействительными.**

УНП 100122726

---

### Изменения в проектной декларации ООО «ДАТЧ СТАР», опубликованной в газете «Звязда» 24.03.2018 г.

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6-11 секции, II очередь строительства, секции 1-3)» (I очередь строительства, 9-й пусковой комплекс).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются:

**4 (четыре)** мото-места площадью от **9** до **14** кв. м, составляющей долларовый эквивалент от **4000** до **4500** долларов США.

**30 (тридцать)** машино-мест площадью от **11,5** до **17** кв. м, составляющей долларовый эквивалент от **8000** до **16500** долларов США.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты.

Дополнительную информацию можно получить по адресу:
г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 19, помещение 860.
Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000. УНП 191061436

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «МОСТОВДРЕВ»

| | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 | Лот № 4 |
|---|---|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальные строения: инв. № 450/С-22310*** (здание магазина с холодной пристройкой, брусья, обшитые вагонкой, 1960 г. п., 72,2 кв. м); **инв. № 450/С-24226** (продовольственный склад, блочный, 1995 г. п., 29,7 кв. м) | **Капитальное строение инв. № 450/С-28632** (здание конторы служебное с подвалом, кирпичное, 1946 г. п., 346,1 кв. м) | **Капитальные строения: инв. № 450/С-28244** (здание ремонтно-механической мастерской, кирпичное, 1981 г. п., 755,6 кв. м); **инв. № 450/С-24228** (котельная, кирпичная, 1995 г. п., 163,0 кв. м) | **Капитальные строения: инв. № 450/С-24229** (склад, кирпичный, 1982 г. п., 135,0 кв. м); **инв. № 450/С-24241** (склад, кирпичный, 1946 г. п., 301,6 кв. м) |
| Сведения о земельном участке | кадастровый номер 425450100001009054, площадь 0,0500 га, назначение – для обслуживания зданий и сооружений, право аренды по 06.08.2068 г. | кадастровый номер 425450100001009055, площадь 0,0883 га, назначение – для обслуживания административно-хозяйственного здания, право аренды по 06.08.2068 г. | кадастровый номер 425450100001009056, площадь 0,3561 га, назначение – для обслуживания зданий и сооружений, право аренды по 06.08.2068 г. | кадастровый номер 425450100001009057, площадь 0,1400 га, назначение – для обслуживания зданий и сооружений, право аренды по 06.08.2068 г. |
| Обременения | Водоохранная зона рек и водоемов (0,0500 га), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт (0,0015 га) *аренда по 31.12.2018 года | Водоохранная зона рек и водоемов (0,0883 га), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт (0,0001 га) | Водоохранная зона рек и водоемов (0,3561 га) | Водоохранная зона рек и водоемов (0,1400 га) |
| Местонахождение имущества: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. М. Горького, д. 7 | | | | |
| Начальная цена | **52 440 руб. 00 коп. с учетом НДС** | **159 600 руб. 00 коп. с учетом НДС** | **201 600 руб. 00 коп. с учетом НДС** | **116 686 руб. 48 коп. с учетом НДС** |
| Задаток | 2 622 руб. 00 коп. | 7 980 руб. 00 коп. | 10 080 руб. 00 коп. | 5 834 руб. 00 коп. |
| Сведения о продавце | ОАО «Мостовдрев», Гродненская обл., г. Мосты, ул. Советская, 38, тел. 8 (01515) 3 36 63 | | | |
| Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел.: 8 (0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 10 дней с момента проведения аукциона | | Условия оплаты | По соглашению сторон |
| **Торги состоятся 17 декабря 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | | |
| Срок подачи документов | **по 11 декабря 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | | |
| Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8 (0152) 74 49 11, 77 23 79 | | | | |

---

## Извещение о проведении электронных торгов

**Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» 5 декабря 2018 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by/) проводит повторные электронные торги по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске. Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельного участка сроком на 5 лет**

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка / назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей | Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, ул. Мазурова | 500000000006009128 | 0,2500 | Для строительства объекта общественного питания с общественным туалетом по ул. Мазурова в г. Минске / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 92 110,82 | 13 800,00 | 9 868,98 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение объекта – объект общественного питания с общественным туалетом, состав объекта: объект общественного питания, общественный туалет, общая площадь здания до 1,5 тыс. кв. м;<br>возмещение Минскому районному унитарному предприятию «Агрокомбинат «Ждановичи» убытков сельскохозяйственного производства в сумме 143,61 рубля с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения;<br>возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 3 592,05 рубля с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения |
| 2 | г. Минск, ул. Владислава Сырокомли | 500000000003005254 | 0,9637 | Для строительства объекта торговли и общепита с многоуровневой автостоянкой по ул. Владислава Сырокомли в г. Минске / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 389 209,54 | 58 300,00 | 10 747,28 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение объекта – для строительства объекта торговли и общепита с многоуровневой автостоянкой по ул. Владислава Сырокомли, состав объекта: объект торговли, объект общественного питания, многоэтажный гараж-стоянка, объект торговли – 1000–1300 кв. м, объект общественного питания – 300–500 кв. м, многоэтажный гараж-стоянка – до 400 машино-мест (не менее 300 машино-мест для обслуживания жителей района);<br>возмещение открытому акционерному обществу «Щомыслица» убытков сельскохозяйственного производства в сумме 118,89 рубля с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения;<br>возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 2 400,48 рубля с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения |
| 3 | г. Минск, в районе ул. Владислава Сырокомли | 50000000003005252 | 1,3300 | Для строительства объекта общественно-коммунального назначения в районе ул. Владислава Сырокомли в г. Минске / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 362 256,75 | 54 300,00 | 10 243,40 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами – объекты автосервиса (не более 50 %), предприятия торгово-бытового назначения, административные помещения;<br>возмещение открытому акционерному обществу «Щомыслица» убытков сельскохозяйственного производства в сумме 1 215,76 рубля с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения;<br>возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 26 011,09 рубля с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения |
| 4 | г. Минск, в районе ул. Корженевского – ул. Кижеватова | 500000000004006204 | 2,9164 | Для строительства объекта «Многофункциональный общественный комплекс с перехватывающим паркингом в районе ул. Корженевского – ул. Кижеватова» / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 1 030 441,46 | 154 500,00 | 10 706,98 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: состав объекта строительства (функциональный состав комплекса) – торговый центр, объект общественного питания до 100 пос. мест, административно-деловой центр, многоуровневая автостоянка – перехватывающий паркинг (в т. ч. с возможностью использования подземного пространства); показатели по вместимости объектов строительства – общая площадь многофункционального комплекса с перехватывающим паркингом до 127 000 кв. м |
| 5 | г. Минск, ул. Подлесная | 500000000001035059 | 0,1798 | Для строительства объекта торгового назначения по ул. Подлесной в г. Минске / земельный участок для размещения объектов розничной торговли | 40 620,38 | 6 100,00 | 9 543,74 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: состав объекта строительства – торговый объект, открытые наземные парковки (назначение торгового объекта определяется архитектурно-планировочным заданием), показатели по вместимости объектов строительства – до 600 кв. м общей площади;<br>возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 2 328,11 рубля с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения |
| 6 | г. Минск, ул. Петра Глебки | 500000000006009160 | 0,3741 | Для строительства объекта «Детский развлекательный центр по ул. Петра Глебки в г. Минске» / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 144 735,51 | 21 700,00 | 10 484,07 | проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение земельного участка и его частей – для строительства детского развлекательного центра в парке «Тиволи», состав объекта строительства – детский развлекательный центр;<br>показатели по вместимости объекта строительства – до 1100 кв. м |

*Убытки и потери сельскохозяйственного производства подлежат пересчету с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения.

**Продавец:** Минский городской исполнительный комитет, пр-т Независимости 8, 220030, г. Минск, сайт: www.minsk.gov.by

**Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки:** Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 2261672, 327-40-22, сайт: www.mgcn.by.

**Порядок проведения электронных торгов:** электронные торги проводятся в соответствии с **регламентом** информационной торговой системы ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 (далее – Положение).

**Для участия в электронных торгах необходимо** ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу **http://minskestate.by**, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах – **29.11.2018 г.**

Дата и время начала проведения электронных торгов**: 5 декабря 2018 года в 11.30** (по времени на сервере ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ»).

**Победитель** электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5 % (претендент на покупку), в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

– внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

– выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона **договор аренды земельного участка сроком на 5 лет**.

**Размер штрафа, уплачиваемого участником повторных электронных торгов и (или) их победителем (претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет:**

по земельному участку для строительства объекта общественного питания с общественным туалетом по ул. Мазурова в г. Минске – **13 800,00 руб.** (тринадцать тысяч восемьсот белорусских рублей);

по земельному участку для строительства объекта торговли и общепита с многоуровневой автостоянкой по ул. Владислава Сырокомли – **58 300,00 руб.** (пятьдесят восемь тысяч триста белорусских рублей);

по земельному участку для строительства объекта общественно-коммунального назначения в районе ул. Владислава Сырокомли – **54 300,00 руб.** (пятьдесят четыре тысячи триста белорусских рублей);

по земельному участку для строительства объекта «Многофункциональный общественный комплекс с перехватывающим паркингом в районе ул. Корженевского – ул. Кижеватова» – **154 500,00 руб.** (сто пятьдесят четыре тысячи пятьсот белорусских рублей);

по земельному участку для строительства объекта торгового назначения по ул. Подлесной в г. Минске – **6 100,00 руб.** (шесть тысяч сто белорусских рублей);

по земельному участку для строительства «Детский развлекательный центр по ул. Петра Глебки в г. Минске» – **21 700,00 руб.** (двадцать одна тысяча семьсот белорусских рублей).

**Прием заявлений** на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется **по 29.11.2018** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2, тел. (017) 2261672.

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ» **(http://minskestate.by).**

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Кішэннік. Гну. Абарот. Аладкі. Асадак. Кораб. Кока. Загар. Каштан. Ягуар. Аловак. Онікс. Лато. Аграрак. **Па вертыкалі:** Куфар. Шчака. Нарад. Куток. Граблі. Біс. Апока. Асака. Рогат. Баран. Кацялок. Гузік. Краса. Школа. Агата. Вар. Кок.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.40 | 17.08 | 8.28 |
| Віцебск — | 8.35 | 16.52 | 8.17 |
| Магілёў — | 8.30 | 16.58 | 8.28 |
| Гомель — | 8.21 | 17.01 | 8.40 |
| Гродна — | 8.54 | 17.24 | 8.30 |
| Брэст — | 8.49 | 17.31 | 8.42 |

## Месяц

*Першая квадра 15 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр. Аляксандра, Арсенія.*
*К. Альжбеты, Валерыі, Саламеі, Валерыя, Здзіслава, Рыгора.*



Фота Андрэя САЗОНАВА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў




**Даты | Падзеі | Людзі**

### 17 ЛІСТАПАДА

**У краіне**

**1828** год — нарадзіўся (вёска Станькава, цяпер у Дзяржынскім раёне) Эмерык Карлавіч Чапскі, дзяржаўны дзеяч, калекцыянер, мецэнат. Член Рускага археалагічнага таварыства, Маскоўскага нумізматычнага таварства. Скончыў Маскоўскі ўніверсітэт. З 1851 года працаваў у Міністэрстве ўнутраных спраў, з 1863 года быў наўгародскім губернатарам, пазней — дырэктарам Ляснога дэпартамента Міністэрства дзяржаўнай маёмасці. У 1879—1894 гадах жыў у Станькаве, дзе заснаваў музей, сабраў нумізматычную, археалагічную, іканаграфічную калекцыі, а таксама калекцыі малюнкаў, гравюр, зброі, прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У яго бібліятэцы (каля 20 тысяч тамоў) былі рэдкія кнігі, калекцыі рукапісаў. Памёр у 1896 годзе.

**1870** год — нарадзіўся (г. п. Хоцімск) Сяргей Мікалаевіч Блажко, савецкі астраном, член-карэспандэнт АН СССР. У 1892 годзе скончыў Маскоўскі ўніверсітэт, дзе працаваў з 1896 года. Аўтар навуковых прац па астрафотаметрыі і астраноміі. Упершыню сфатаграфаваў і растлумачыў спектры метэораў (1904), упершыню ў Расіі даследаваў вышыні іх згарання. Прапанаваў першую поўную тэорыю зацьмення-падвойных зорак, новы метад выяўлення малых планет. Сканструяваў шэраг астранамічных прыбораў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1956 годзе. Яго імем названы малая планета і кратар на Месяцы.

**У свеце**

*Міжнародны дзень студэнтаў. Устаноўлены ў 1946 годзе на Сусветным кангрэсе студэнтаў, які адбыўся ў Празе, у памяць аб чэшскіх студэнтах-патрыётах, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1939 годзе.*

**1788** год — нарадзіўся Міхаіл Сямёнавіч Шчэпкін, рускі акцёр, заснавальнік рэалізму ў рускім сцэнічным мастацтве, рэфарматар рускага тэатра. З 1823 года ў Маскоўскім тэатры (з 1824 года — Малы тэатр). Сярод роляў: Фамусаў («Гора ад розуму» А. Грыбаедава), Гараднічы («Рэвізор» М. Гогаля) і іншыя. Памёр у 1863 годзе.

**1869** год — адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця Суэцкага канала, які злучыў Міжземнае і Чырвонае мора, для суднаходства. Першай па канале прайшла яхта «Эгль», на борце якой знаходзілася французская імператрыца Яўгенія, жонка Напалеона III, і галоўны будаўнік канала — французскі інжынер віконт Фердынанд Мары дэ Лесепс. На першых этапах земляныя работы на канале праводзіліся з выкарыстаннем прымусовай працы бедных слаёў насельніцтва Егіпта. З тэхнічнага пункту гледжання будаўніцтва, якое вялося 11 гадоў, не было вельмі складаным: капалі проста роў даўжынёй 163 км, без усялякіх шлюзаў. Тым не менш гэты праект літаральна разбурыў Егіпет. Да адкрыцця канала транспарціроўка ажыццяўлялася шляхам разгрузкі караблёў і сухапутнай перавозкай паміж Міжземным і Чырвоным морамі. Канал сыграў таксама важную ролю ў экспансіі і наступнай каланізацыі Афрыкі.



## УСМІХНЕМСЯ

**Аб'ява.**
**«Рэстарану патрабуецца выкідала, каб растлумачыць папярэднямy выкідалу, што той больш там не працуе».**

— А я вось рыбачыць люблю, але не ўмею.
— А што там умець — налівай ды пі.
— Гэта можа перарасці ў хранічны турызм.

**У сям'і, дзе ўсе храпуць, засынаюць наўыперадкі.**

— Яша, што вы робіце лепш за ўсё на свеце?
— Дык адкладаю на потым.
— І што вы адкладаеце?
— Я потым вам раскажу.

**Крыўдна, калі кот цэлымі днямі жарэ, спіць, нічога не робіць, а жонка яго любіць.**

— Колькі разоў твая мама выходзіла замуж?
— Мне нават сказаць нямка...
— Ну, у наш час...
— Адзін раз.

**Сярод жонак расійскіх алігархаў выраз «Выглядаеш на мільён» лічыцца абразай.**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4169.

Нумар падпісаны ў 19.30 16 лістапада 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12